PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

http://niva.iig.pl
redakcja@niva.iig.pl

№ 34 (2467) Год XLVIII | Беласток, 24 жніўня 2003 г. | Цана 2,00 зл.

Нацыянальная палітыка III Рэчы Паспалітай

Яўген Мірановіч

Пры канцы васьмідзесятых гадоў сітуацыя нацыянальных меншасцей у Польшчы рашуча пачынала мяняцца ў лепшым напрамку. Адыход ад шавіністычнай лініі выразна адчувалася яшчэ ў час, калі пры ўладзе была апошняя камуністычная групоўка пад камандаваннем Вайцеха Ярузельскага. Афіцыйна прызналі тады існаванне ў Польшчы грамадзян няпольскай нацыянальнасці. Хаця пішацца, што еўрапеізацыя ўнутранай палітыкі пачалася з 1989 г., але варта заўважыць, што пару гадоў раней апублікаваны былі ў падпольнай і афіцыйнай прэсе тысячы артыкулаў пра існуючую праблему непалякаў, пражываючых у межах краіны. Канферэнцыі, прысвечаныя нацыянальным меншасцям, арганізавалі універсітэты, каталіцкія арганізацыі, а ў канцы нават дзяржаўна-партыйная адміністрацыя. Невядома адкуль з'явілася тады раптам у Польшчы пару соцень тысяч немцаў, якіх паводле афіцыйнай прапаганды не было ўжо дзесяткі гадоў. Паказаліся таксама яўрэі, хаця грамадска-палітычным элітам здавалася, што ўсіх здолелі выгнаць з краіны ў 1968 г. Нечакана для ўсіх ажывілася таксама беларускае, славацкае, украінскае і лэмкаўскае асяроддзі, якія лічыліся цалкам асімілаванымі.

У 1989 г. уплыў на нацыянальную палітыку дзяржавы пачалі мець людзі антыкамуністычнай апазіцыі, а асабліва вялікі ідэаліст Яцэк Курань, якому справы нацыянальных меншасцей удалося вывесці з Міністэрства ўнутраных спраў і замацаваць іх у структурах Міністэрства культуры. Адпаведны дэпартамент у Міністэрстве культуры ўзначаліла тады маладая дзяячка „Салідарнасці" Багуміла Бэрдыхоўская, вялікая паклонніца рэалізацыі ідэі замежнай і ўнутранай палітыкі, прапагандаванай асяроддзем парыжскай „Культуры".

У пачатку дзевяностых гадоў у асяроддзі нацыянальных меншасцей пачало расці перакананне ў трываласці зменаў, што адбываліся ў Польшчы. Людзі пераставалі баяцца, пачалі арганізавацца. Узнікалі новыя арганізацыі не толькі сярод беларусаў, але таксама ў нямецкім, яўрэйскім, украінскім, славацкім і лэмкаўскім асяроддзі. Рэфармаваная палітычная паліцыя, з новай назвай — Urząd Ochrony Państwa — хаця сачыла можа нават больш дакладна за дзейнасцю арганізатараў нацыянальнага руху чым камуністычная служба бяспекі, але афіцыйна не магла ім перашкаджаць. Польшча выбрала курс на інтэграцыю з Еўропай, а там праследаванне нацыянальных меншасцей успрымалася вельмі дрэнна.

З бюджэту дзяржавы выдзяляліся таксама сродкі, якія дазвалялі меншас-

[працяг ☞ 2]

Фота РАМАНА ВАСІЛЮКА

Лідэр калектыву з Маравіі „Валашскі ваявода" Здэнек Тофэль: „Музыка не ведае межаў"

XIII Музычныя дыялогі над Бугам

Шчаслівая трынаццатка

— Культура гэта універсальная мова, зразумелая ва ўсім свеце, — кажа Здэнек Тофэль, журналіст і музыка з Астравы, лідэр гурту „Валашскі ваявода".

Калектыў Здэнека Тофэля, які быў госцем XIII Музычных дыялогаў над Бугам, пацвярджае гэтыя словы. „Валашскі ваявода" прыехаў з Маравіі, але ў яго рэпертуары перш-наперш карпацкі фальклор. Адтуль назва, якая звязвае гэтых музыкаў з іх продкамі, што прыбылі ў Маравію з Валахіі.

— Песні, музыка не паддаюцца вострому падзелу межамі дзяржаў, — гаворыць Здэнек Тофэль. — Заўсёды ёсць пераходная зона, якая аб'ядноўвае розныя этнасы. Можна гэта ўбачыць хаця б тут, у Мельніку. Гэты рэгіён тым і цікавы, што спатыкаюцца тут уплывы польскія, беларускія, украінскія. Думаю, што такія месцы, гэта багацце, з якога павінны чэрпаць не толькі палякі, але і ўся Еўропа.

Дзякуючы мельніцкай імпрэзе Буг з гранічнай ракі стаў сімвалам яднання народаў. Спачатку Музычныя дыялогі мелі ўкраінска-польскі характар, але пяць гадоў таму сталі Агульнапольскімі прэзентацыямі культуры нацыянальных меншасцей. З тае пары галоўнымі арганізатарамі мерапрыемства з'яўляюцца Беларускае грамадска-культурнае таварыства і гміна Мельнік.

— Дыялогі з году ў год пашыраюцца, — не без гонару ў голасе кажа войт Яўген Віхоўскі, — прыязджаюць да нас не толькі найбліжэйшыя суседзі, але і экзатычныя госці з далёкіх краін. Я, хаця не забабонны, перажываў моцна за сёлетнюю імпрэзу, бо ж трынаццатая. Цяпер бачу, што дарма. Усё ідзе добра. Кожны, хто сюды завітае падчас двухдзённага свята, напэўна знойдзе тое, што застанецца яму ў сэрцы надоўга.

Маляўнічае ўрочышча Тапаліна над Бугам у днях 9-10 жніўня кішэла народам. Былі тут ларкі з цацкамі, каляровымі шарамі і цукровай ватай. Сваім мастацтвам ганарыліся кавалі і ганчары, а мясцовыя кухары прапанавалі бульбяную бабку, шмалец, кіслае малако. Увечары можна было паглядзець, як Буг рассвятляюць феерверкі, а ўдзень праплысціся па рацэ караблікам з чорным пірацкім сцягам. Над берагам Буга нястомны кнігар Ян Заброцкі прапанаваў вялікую падборку славянскай літаратуры ды кніжак пра нацыянальныя меншасці ў Польшчы.

— Я думаю, што прыйшоў час, калі ўсё больш людзей у Польшчы разумее, — кажа Янка Заброцкі, — што культуру Польшчы ствараюць усе яе грамадзяне розных нацыянальнасцей і розных веравызнанняў.

З тымі словамі пагаджаецца і Ян Сычэўскі, старшыня Беларускага грамадска-культурнага таварыства:

— Думаю, што гэта адно з важнейшых мерапрыемстваў у нашым ваяводстве, — гаварыў ён. — Не толькі для меншасцей. Усё больш прадстаўнікоў большасці таксама высока ацэньвае культуру меншасцей.

Асабліва песню. Бо яна была найважнейшай на надбужанскай сцэне. На працягу двух дзён у Мельніку гучалі песні: беларускія, украінскія, лэмкаўскія, славацкія, чэшскія, грэцкія, цыганскія, яўрэйскія і, вядома, польскія. Публіка ўсіх выканаўцаў прыняла вельмі цёпла. Музыка не ведае межаў.

Мікола Ваўранюк

Грошы — расійскія, незалежнасць — беларуская?

Апазіцыйныя медыі ўжо падаюць дасягнутыя пагадненні як страту незалежнасці Беларусі. Але, здаецца, гэта не зусім так. Сапраўды знікае адна з рыс дзяржаўнага суверэнітэту — уласная валюта. Аднак Беларусь не перастае існаваць як суб'ект міжнароднага права.

☞2

Меншая задужанасць бальніцы

Каб паменшаць кошты працы гайнаўскай бальніцы дырэкцыя вядзе яе рэструктурызацыю. Абмяжоўваецца колькасць работнікаў і кошты працы паасобных аддзяленняў. Вясковыя амбулаторыі перадаюцца на ўласнасць гмінам. Апошнім часам скарыстоўваецца менш электра- і цеплаэнергіі.

☞3

Не бойцеся негра на мяжы

На польска-беларускай мяжы сапраўды некалькі дзён раней быў негр. Разам з Кракаўскім аддзяленнем Польскага тэлебачання здымалі мы фільм пра Сакрата Яновіча. У здымачнай групе быў Браян Скот — чарнаскуры журналіст, вядучы тэлепраграму „Этнічныя кліматы".

☞4

Новыя нявольнікі

Пры вярбоўцы жанчынам прапануецца працу манекеншчыц, кухарак, барменак, танцорак, нянек, збіральніц пладоў. Асабліва папулярныя славянкі. У Францыі рускіх прастытутак больш за ўсё ў Парыжы, у Канах і Ніцы. Вызваліцца ад сексуальнага рабства практычна немагчыма без дапамогі звонку.

☞5

Перад цудадзейнай іконай

У святкаваннях прысутнічалі прадстаўнікі лакальных улад Супрасля, якім за рашэнне аб вяртанні катакомбаў падзякаваў епіскап Беластоцкі і Гданьскі Іакаў. Хаця пастанова не набыла яшчэ законнай сілы, праваслаўным дазволілі адслужыць паніхіду каля астанкаў манахаў (раней трэба было маліцца каля плота).

☞9

Як Герэк і Ярашэвіч у Белавежы гасцявалі

1 верасня Герэк і Ярашэвіч наведалі Прыродазнаўчы музей. Запамятаўся мне асабліва вось такі смешны эпізод. Пасля ўваходу госці пакінулі свае плашчы на прылаўку раздзявальні. Услужны прыбіральшчык, Васіль Грыгаровіч, хацеў іх павесіць на вешалцы, але ў той момант падскочылі да яго ахоўнікі і забаранілі яму нават датыкацца да вопраткі гасцей.

☞10

Беларусь — беларусы

Нацыянальная палітыка III Рэчы Паспалітай

[1 ☞ працяг]
цям арганізаваць культурнае жыццё значна шырэй чым межы фальклору. Сваё месца ў арганізацыі культурнага жыцця знайшла таксама моладзь. Беларускае „Басовішча" гэта штосьці больш, чым лакальнае культурнае мерапрыемства.

Ліберальная палітыка паспрыяла таксама нараджэнню рэгіянальных рухаў, канчатковага выніку якіх цяжка прадбачыць. Хаця палякі не хочуць прызнаць сілезскую нацыянальнасць, але яна ў сапраўднасці ўжо існуе, таму што людзі так сябе бачаць. Значна слабейшы кашубскі рух моцна падзелены. Частка кашубаў лічыць сябе асобным народам, большасць — рэгіянальнай этнічнай польскай групай. Першыя аднак больш актыўныя і дамагаюцца сваіх школ, кашубскай мовы ў лакальнай адміністрацыі і правоў належных нацыянальным меншасцям.

Ліберальная палітыка ў адносінах да нацыянальных меншасцей трывала аднак надта коратка. Вельмі хутка Міністэрства ўнутраных спраў вярнула сабе ролю каардынатара нацыянальнай палітыкі, а гэта абазначае інструментальнае трактаванне меншасцей. Раней прынцыпы палітыкі вызначаліся падчас сустрэч прадстаўнікоў меншасцей з прадстаўнікамі Міністэрства культуры, намеснікамі прэм'ер-міністра, зацікаўленымі пасламі. Усё адбывалася падчас доўгіх размоваў, часам вельмі вострых і не надта прыемных, але можна было змагацца за свае рацыі.

Ад некалькіх гадоў, як у час улады „інтэрнацыяналістаў" — „партыя ведае найлепей чаго нам трэба". Лёс Фестывалю царкоўнай музыкі паказвае ў якім напрамку будуць развівацца падзеі. Зараз пасля кантролю НІКу ў „Ніве" пачаўся кантроль арганізацыі, якую ўзначальвае Мікола Бушко. Праўдападобна ад яе вынікаў будзе залежны далейшы лёс Фестывалю. Палітыка, прынамсі ў справе беларусаў, пачынае запаўняцца зместам з санацыйнай эпохі, захоўваючы форму геркаўскага перыяду. Але прыглядаючыся бліжэй лэмкаўска-ўкраінскай праблеме, рэалізуецца яна ад некалькіх гадоў і ў адносінах да таго асяроддзя. Вынік яе для ўкраінцаў быў відавочны падчас апошняга перапісу насельніцтва.

Хаця ў Польшчы пражывае толькі некалькі працэнтаў насельніцтва нямецкай нацыянальнасці, палітычныя эліты зусім не ведаюць як ставіцца да гэтай праблемы. Паўтараюць тыя самыя памылкі, што іх папярэднікі, хаця ўсё паказвае, што нацыяналістычны варыянт рэалізаваны нават у аксамітных рукавічках прыносіў вялікія шкоды краіне. Ад звыш дзесяці гадоў Сейм не можа прыняць закону аб нацыянальных меншасцях. Абазначае гэта, што кампетэнцыі ў гэтай справе перададзены адміністрацыі і палітычнай паліцыі. На практыцы гэты адрэзак унутранай палітыкі пазбаўлены якога-небудзь грамадскага кантролю. На жаль, пра тое што дакладна плануецца ў чыноўніцкіх і паліцэйскіх кабінетах гісторыкі даведаюцца найраней толькі праз 50 гадоў. Можа некаторыя будуць ведаць раней, але яны інфармацыю атрымаюць не на тое, каб пісаць праўду.

Яўген Мірановіч

Закруцілі ў цэмент

Польшча прыпыніла да студзеня 2004 г. антыдэмпінгавае расследаванне ў адносінах да беларускіх пастаўшчыкоў цэменту. На такі крок польскаму ўраду прыйшлося пайсці пасля зваротаў больш 30 мясцовых атрымальнікаў беларускай прадукцыі, а таксама афіцыйнай ноты Беларускага Міністэрства замежных спраў з папярэджаннем аб адваротным абмежаванні ўвозу польскіх будаўнічых матэрыялаў на суму 15 мільёнаў долараў.

У мінулым годзе тры замежныя кампаніі, якія маюць у Польшчы свае ўласныя цэментныя заводы, заініцыявалі антыдэмпінгавае расследаванне ў адносінах да беларускіх пастаўшчыкоў цэменту ў гэтую краіну. За апошнія гады імпарт беларускага цэменту, па ацэнках польскіх экспертаў, вырас у 188 разоў і ў 2002 г. склаў 450 тыс. тон.

Галоўным канкурэнтам польскіх вытворцаў стала прадукцыя мадэрнізаваных заводаў у Крычаве, і асабліва, „Красносельскстройматериалы", геаграфічна распаложаны побач з паўночна-ўсходнім раёнам Польшчы, дзе значна менш цэментных заводаў, чым на астатняй тэрыторыі. За два гады ўвесь беларускі цэмент прайшоў сертыфікацыю паводле стандарту ISO 9000, атрымаў стандарты адпаведнасці Нямеччыны, Польшчы, Літвы і Латвіі, захаваўшы пры гэтым больш нізкую чым польскі цэмент цану нават з улікам прыбытковасці.

Эканамічная выгада заставіла больш чым 30 польскіх атрымальнікаў беларускага цэменту звярнуцца ў Сейм з просьбай не ўводзіць абмежавання на пастаўкі беларускай вытворчасці. Нядаўна да іх далучылася і польская гандлёва-прамысловая палата, якая ўлічыла сур'ёзную пагрозу беларускага МЗС у выпадку ўвядзення абмежаванняў на імпарт польскіх будматэрыялаў на суму экспарту беларускага цэменту — 15 млн. дол. У польскага боку практычна не хапіла аргументаў, каб закрыць свой рынак для беларускіх цэментных заводаў. У час кансультацый па антыдэмпінгавай працэдуры былі запатрабаваны даныя па аб'ёмах будаўніча-мантажных работ унутры Беларусі — палякі прапанавалі, што ва ўмовах згортвання будаўнічых праграм унутры краіны беларусам прыходзіцца ў большай ступені экспартаваць цэмент. Аднак, нягледзячы на тое, што па выніках паўгоддзя аб'ём СМР у Беларусі вырас на 7%, пастаўкі цэменту ў Польшчу за сем месяцаў бягучага года павялічыліся на 10%.

Зрэшты, бясконца павялічваць экспарт цэменту заходняй суседцы Беларусь усё роўна не зможа. У адпаведнасці з польскім заканадаўствам пры павышэнні замежных паставак цэменту вышэй 5% унутранай вытворчасці антыдэмпінгавая працэдура з абмежаваннем увозу ў краіне пачынаецца аўтаматычна. А ўвоз беларускага цэменту ў мінулым годзе дасягнуў крытычнай рысы — 4,6% унутранай польскай вытворчасці. Беларускім заводам прыйдзецца асвойваць іншыя рынкі збыту — напрыклад, Расіі. (...)

Вольга Мікша

„Белорусская газета", № 30, 11.08.2003 г.

Грошы — расійскія, незалежнасць — беларуская?

Галоўнай фінансавай інтрыгай апошняга летняга месяца ў Беларусі ўжо без перабольшання можна назваць падзеі вакол так званага аб'яднання грашовых сістэм. Як вядома, перавод на расійскі рубель усёй беларускай гаспадаркі быў адным з прыярытэтаў палітыкі прэзідэнта А. Лукашэнкі. Праўда, называлася гэта чамусьці менавіта аб'яднаннем грошай абедзвюх краін, а не адмовай Беларусі ад уласнага плацёжнага сродка.

Фінансавае аб'яднанне набыло не толькі новае гучанне, але і новы штуршок пасля таго як летась прэзідэнт Расіі прапанаваў Беларусі перайсці на расійскія грошы ўжо ў 2004 годзе. Такая перспектыва імклівага „збліжэння" крыху ахаладзіла пыл беларускіх інтэгратараў на чале з кіраўніком Беларусі. Яны чамусьці загаварылі аб тэхнічных праблемах і розных „аб'ектыўных" абставінах немагчымасці такога хуткага аб'яднання. У рэшце рэшт за канчатковы тэрмін увядзення расійскай валюты ў Беларусі была вызначана дата 1 студзеня 2005 года.

Аднак не ўсё аказалася так проста. Пазней выявілася яшчэ больш разыходжанняў, наяўнасць якіх была падагульнена словамі беларускага прэзідэнта аб тым, што пераход на расійскую валюту для Беларусі не самамэта. Нягледзячы на нібыта інтэгратарскія памкненні кіраўніка беларускай дзяржавы, логіка ягоных дзеянняў сведчыла пра тое, што галоўнай сваёй мэтай ён бачыць выйсце на расійскае палітычнае поле. Гэта яскрава засведчыла адмысловая прэс-канферэнцыя А. Лукашэнкі 70-ці расійскім журналістам, дзе на шчыт узнімалася панславісцкая рыторыка і спекуляцыі на настальгіі па Савецкім Саюзе і ягонай магутнасці (гл. мінулы нумар „Нівы").

Сёння ўжо можна сказаць, што сваімі дзеяннямі беларускі прэзідэнт разбудзіў расійскага мядзведзя. Літаральна ў той жа дзень, а дакладней 1 жніўня, яму патэлефанаваў Уладзімір Пуцін. Аналіз паступіўшай інфармацыі ў прэсе дазваляе з высокай доляй верагоднасці сцвярджаць, што менавіта тады пад ціскам расійскага боку і была „дасягнута дамоўленасць аб вызначэнні даты сустрэчы, на якой будзе канчаткова закрыта пытанне аб увядзенні адзінай валюты". Аб гэтым расійскі прэзідэнт паведаміў 11 жніўня свайму ўраду, дадаўшы, што „трэба рашаць пытанне аб увядзенні адзінай валюты альбо так, альбо інакш". Гэта сведчыць пра тое, што расійскае кіраўніцтва ўсур'ёз занялося тым да чаго ўсе гады яго нібыта заклікаў беларускі прэзідэнт. Але занялося не зусім у такім рэчышчы, у якім вельмі хацелася б апошняму.

Крэмль пераняў лукашэнкаўскую гульню ў папулізм і выкарыстаў для гэтага такі прыём з арсенала спецслужб як дэзінфармацыя. Менавіта гэтак можна назваць паступіўшыя напярэдадні паведамленні аб згодзе Масквы на існаванне двух эмісійных цэнтраў, што абазначала б перадачу Мінску магчымасці друкавання часткі расійскіх грошай. Весткі аб такой „саступцы" прайшлі па расійскіх СМІ, іх ужо пачалі каментаваць і абмяркоўваць фінансісты і палітолагі абедзвюх краін. У выніку беларускае кіраўніцтва было выстаўленае як цвёрдае і непахіснае ў сваіх памкненнях, а Крэмль, нібыта, прызнаў, што яно мае рацыю і зрабіў „крок назад".

Але наступнае пасяджэнне расійска-беларускай рабочай групы па падрыхтоўцы пагаднення аб увядзенні адзінай валюты, дзе старшынявалі кіраўнікі абодвух цэнтральных банкаў, засведчыла, што бакі цалкам пагадзіліся з тым, што друкаваць расійскія грошы будзе толькі Цэнтрабанк Расіі, вырашаць пытанні аб эмісіі будзе толькі савет дырэктараў Цэнтрабанка Расіі, куды будзе ўведзены прадстаўнік Нацбанка Беларусі. Больш таго, вагацца аб тэрмінах увядзення расійскага рубля на тэрыторыі Беларусі ўжо нельга — альбо 1 студзеня 2005 года альбо ніколі. Пытанне пастаўлена рубам. Ні аб якіх умовах, раней выстаўленых А. Лукашэнкам расійскаму боку, кшталту неабходнасці выканання ўсіх ранейдасягнутых эканамічных пагадненняў, нават не ўзгадваецца. Але ўзгадваецца аб магчымасці Беларусі выйсці з зоны хаджэння расійскага рубля. Гэта несумненна звычайны прапагандысцкі хітрык, бо цяжка ўявіць каб цяперашні Крэмль увогуле мог бы дапусціць якое-небудзь аддзяленне. Прыклад — Чачня.

Цяпер дасягнутае пагадненне мусіць падпісаць на бліжэйшай сустрэчы расійскі і беларускі прэзідэнты. Такая сустрэча мае адбыцца найбліжэйшым часам і яна зараз патрэбная У. Пуціну. А. Лукашэнка ж бачыцца прыціснутым да сцяны — Масква, нібыта, зрабіла ўсё, каб засведчыць свае інтэгратарскія памкненні, не даючы пры гэтым ніякіх гарантый падтрымкі беларускаму лідэру ў ягоных прэтэнзіях на неабмежаванае па часе прэзідэнцтва. І гэта пры тым, што ён пакуль мае хоць не надта моцныя, але свае грошы — беларускія рублі. Якая ж будзе размова калі іх у яго не стане?

Апазіцыйныя медыі ўжо падаюць дасягнутыя пагадненні як страту незалежнасці Беларусі. Але, здаецца, гэта не зусім так. Сапраўды знікае адна з рыс дзяржаўнага суверэнітэту — уласная валюта. Аднак Беларусь не перастае існаваць ні як суб'ект міжнароднага права, ні ў свядомасці большай часткі насельніцтва краіны. Сваю незалежнасць губляе цяперашні беларускі прэзідэнт. Але гэта — ягоны выбар.

Уладзімір Лапцэвіч

У Зэльве стане помнік Ларысе Геніюш

Помнік беларускай паэтэсе Ларысе Геніюш будзе ўстаноўлены ў Зэльве (Гродзенская вобласць) насупраць дома, дзе доўгі час яна жыла. Аб гэтым паведаміў Міхась Скобла, укладальнік кнігі Ларысы Геніюш, якая выйшла ў свет два гады таму ў выдавецтве „Беларускі кнігазбор", у час святкавання дня нараджэння паэтэсы, якое 9 жніўня прайшло ў Зэльве.

У мерапрыемстве прысутнічалі каля ста чалавек з розных куткоў Беларусі. Святкаванне праходзіла ў некалькі этапах: спачатку Святую Літургію адслужыў настаяцель Каложскай царквы а. Аляксандр, затым на магіле паэтэсы ўскладзены былі кветкі. Пад бел-чырвона-белымі сцягамі размаўлялі аб ёй былыя вязні ГУЛАГа, якія памятаюць Ларысу Геніюш, кіраўнікі грамадскіх аб'яднанняў Гродзенчыны. Затым, непадалёк могільніка адбыўся канцэрт беларускіх бардаў, якія выконвалі песні на вершы паэтэсы.

У гэтым годзе Ларысе Геніюш споўнілася б 93 гады.

„Белорусская деловая газета", 12.08.2003 г.

Меншая задоўжанасць бальніцы

У час апошняй сесіі Рады Гайнаўскага павета разглядалася фінансаванне дзейнасці Самастойнага публічнага комплексу аховы здароўя ў Гайнаўцы. Дырэктар комплексу Рыгор Тамашук паінфармаваў, што за апошнія месяцы гайнаўская бальніца выпрацавала даход. Хаця задоўжанасць гайнаўскага комплексу аховы здароўя застаецца вялікай (каля 3 мільёны зл.), то паявілася надзея на яе скарачэнне.

Каб паменшыць кошты працы гайнаўскай бальніцы дырэкцыя вядзе яе рэструктурызацыю. Абмяжоўваецца колькасць работнікаў і кошты працы паасобных аддзяленняў. Вясковыя амбулаторыі (асяродкі здароўя) перадаюцца на ўласнасць гмінам. Апошнім часам скарыстоўваецца менш электра- і цеплаэнергіі. З лекарамі заключаюцца цывільна-юрыдычныя дамовы на начныя дзяжурствы, а з хірургамі, арытмедамі і акулістамі падпісаны асобныя дамовы на амбулаторную работу, што спрычыняецца да дадатковых ашчаднасцей у бальніцы. Зараз вядуцца размовы з прадпрыемствамі-крэдыторамі з мэтай адтэрмінавання сплаты даўгоў.

Задоўжанасць бальніцы ў 2000 годзе складала суму 3 мільёны 555 тысяч зл. У 2001 годзе фінансавы вынік гайнаўскага комплексу аховы здароўя яшчэ пагоршыўся на 19% у параўнанні з папярэднім годам і складаў суму 4 мільёны 237 тысяч зл. У 2002 годзе задоўжанасць бальніцы паменшала і складала суму 2 мільёны 931 тысяча зл. За першыя чатыры месяцы гэтага года даходы бальніцы былі большымі за выдаткі на 35 тысяч злотых. Адносна добры фінансавы вынік бальніца магла атрымаць дзякуючы адкрыцці новых аддзяленняў: рэабілітацыйнага, апякунчага, псіхіятрычнага, выратавальнага, рэарганізацыі аддзяленняў унутраных хвароб і гінекалагічнага. Ашчаднасці прынесла прыватызацыя дадатковых паслуг. За апошнія гады на 270 асоб скарацілася колькасць працаўнікоў комплексу аховы здароўя. Найчасцей адыходзілі асобы ў пенсійным узросце. Многія работнікі атрымалі працу ў новаадкрытых аддзяленнях. Частку зарплатных фондаў для работнікаў бальніцы складаюць сродкі выдзеленыя на рэалізацыю „закона 203". Прадбачвае яна кампенсацыю зарплат для работнікаў службаў аховы здароўя, якая ў гайнаўскай бальніцы рэалізуецца некалькі гадоў. Выплачваюцца цяпер грошы за 2001 год і ёсць рэальны шанц, што работнікі атрымаюць поўную, прадбачаную законам, кампенсацыю.

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Хаця будынкі гайнаўскай бальніцы нядаўна здадзены былі ў карыстанне, зараз мяняюцца ў іх вокны, а некаторыя памяшканні прыстасоўваюцца да патрэб новых аддзяленняў

— Перспектывы развіцця бальніцы трэба разглядаць на фоне дэмаграфічных умоў. У Гайнаўскім павеце самы нізкі ў Падляшскім ваяводстве паказчык нараджэнняў і самы высокі ў ваяводстве паказчык сконаў. Трэба лічыць, што грамадства ў нашым павеце будзе старэць, а паскоранае цывілізацыйнае развіццё спрычыніцца да росту „цывілізацыйных хвароб" (пухліны і псіхіятрычныя расстройствы). Можна прадбачваць, што трэба будзе інвеставаць у аддзяленні лячэння ўнутраных хвароб і працяглага лячэння. Павінна пашырацца даступнасць пацыентаў да лячэння пухліны, рэабілітацыі і лячэння ў псіхіятрычным аддзяленні, — заявіў дырэктар Рыгор Тамашук.

Рэструктурызацыяй бальніцы незадаволены некаторыя яе працаўнікі, якія наракаюць на нізкія зарплаты. У час пасяджэння Рады ставіўся закід, што лячэнне дыябетыкаў у гайнаўскай бальніцы не задавальняе пацыентаў. Некаторыя сярод іх лечацца бясплатна ў доктар Закшэўскай, якая перастала працаваць у гайнаўскай бальніцы. Дырэктар Рыгор Тамашук патлумачыў, што зараз у бальніцы працуюць трое дыябетолагаў, што забяспечвае патрэбы ўсіх хворых.

Аляксей Мароз

Пушчанскі агратурызм

Некалькі гадоў таму шмат людзей пражываючых край Белавежскай пушчы з задорам і аптымізмам рашыла пакарыстацца дадатковай крыніцай прыходаў — агратурызмам. Сёння там можна налічыць каля сарака агратурыстычных кватэр.

Сялянам, якія заняліся агратурызмам, па-рознаму атрымаўся гэты бізнес. Большасць з іх мае з гэтага невялікі прыход, а ёсць і такія заўзятары, якія да агратурысцкай дзейнасці байкавата даплачваюць, аднак яна стала ім свайго роду хобі. Нашы агратурыстычныя паслугі яшчэ не набылі такой вядомасці, як, напрыклад, на Сувальшчыне, дзе ў 1998 годзе дзейнічала каля шасцісот кватэр, якія ў сезон прынялі некалькі дзесяткаў тысяч гасцей. Некаторыя тамашнія гаспадары зарабілі за сезон нават па 50 тысяч злотаў без падатку. Бо калі наймаецца да пяці пакояў, тады крыніца даходаў не абкладзена налогам. У 2000 годзе на Сувальшчыне прапанавала начлегі ўжо дзве тысячы кватэр!

Сама Белавежа карыстаецца зацікаўленнем, але лік агратурыстычных кватэр у яе наваколлі невялікі. Усяго там 36 агратурыстычных гасцявальняў; найбольш у Белавежскай — 15, Нараўчанскай — 9, Гайнаўскай і Дубіцкай — па 5 і Кляшчэлеўскай гмінах — 2. Згуртаваныя яны ў Белавежскім агратурыстычным аб'яднанні „Зубр" у Гайнаўцы і прапануюць разам 288 начлежных месц.

Фота МІХАЛА МІНЦЭВІЧА

Вольга Скавародка з каровай, якая „дае" кіслае малако турыстам

Наведаў я агратурыстычную гасцініцу Вольгі і Анатоля Скавародкаў у Дубічах-Царкоўных, якую яны вядуць ад трох гадоў (усяго ў Дубічах-Царкоўных тры кватэры). Сям'я Скавародкаў выдзеліла для агратурыстычных мэтаў цэлы паверх свайго вялікага драўлянага дома ды яшчэ памяшканні ў гаспадарчым будынку. У хаце некалькі пакояў з балконам, адкуль можна любавацца панарамай наваколля. На стале раскладзены буклеты з інфармацыямі для наведвальнікаў, ёсць нават багатая дамашняя бібліятэка. Гаспадыня, хаця, як прызнаецца, не мае ніякіх атэстатаў, можа служыць гідам і інфарматарам пра ўсе мясцовыя славутасці.

— Адкуль людзі даведваюцца пра вашу гасцініцу? — пытаю спадарыню Вольгу.

— Агратурыстычнае аб'яднанне „Зубр" выпусціла інфарматар, ёсць таксама весткі ў Інтэрнэце — нашы сыны самі зрабілі нам свой сайт. За начлег просім па 15 злотаў ад асобы за суткі — калі начлегаў больш, а за адзін начлег бярэм 20 злотаў.

— А што найбольш цікавіць турыстаў у нас?

— Большасць збіраецца на вёску для адпачынку, шукае галоўным чынам цішыні, спакою. Прыязджаюць пабачыць Белавежскую пушчу, у грыбы або і на рыбалку. Цікавяцца таксама помнікамі даўніны, жыццём нашых людзей.

— Ці знаходжанне на „турысцкім маршруце" гарантуе нейкія грошы, за якія можна жыць і пасля сезона?

— Турыстаў, у прынцыпе, нямнога. Бываюць перыяды, напрыклад доўгі уікэнд у пачатку мая, калі нават і ўдвая большая колькасць месц была б запоўнена. Але наогул колькасць наведвальнікаў памяркоўная.

— Ці маеце пастаянных гасцей, якія наведваюць толькі вас?

— Адна турыстка з Варшавы, Эва Варэліс, прыязджала тройчы ў год. Іншыя помняць і прысылаюць адкрыткі.

— Ці бываюць гарэзлівыя турысты, выпівакі?

— Такімі гасцямі мы не зацікаўлены, бо гэта дадатковы клопат нам, непарадак, непаразуменні. У нас гасцююць галоўным чынам статныя людзі, і мы ім рады, і думаю, што яны таксама задаволены. Гасцявала раз група моладзі, якая ўсю ноч не дазволіла заснуць.

— А як задавольваеце кулінарныя патрабаванні гасцей? Мо прапануеце гараджанам нешта тыпова вясковае?

— Турысты могуць самыя кухарыць, а могуць заказаць і ў мяне. Трымаем карову, дык маем сваё малако, ад сваіх індыкоў і курэй маем свежыя яйкі. Гасцююць у нас аматары кіслага малака або саланіны; некаторыя самыя смажаць яйкі на саланіне.

Калі хто любіць пушчу, таму варта наведаць нашу чароўную ваколіцу, — захвочвае Вольга Скавародка. І немагчыма не згадзіцца з ёю.

Міхал Мінцэвіч

Дзе коратка, там рвецца

Калі загаварылі аб рок-фестывалі ў Жарах і дадатковым транспарце для перавозкі ўдзельнікаў зборышча, дык Прадпрыемства рэгіянальных пасажырскіх перавозаў у Беластоку рашыла падаслаць восем цягнікоў са свайго запасу. Пяць складаў двух'ярусных вагонаў былі пасланы з Чаромхі і тры з Беластока. Вагоны адпраўляліся ў належным стане, а вярнуліся зруйнаваныя. Як даведаўся я ў вагоннай службе, у васьмі цягніках было разбітых больш за сто трыццаць шыб у вагонах. „Жыўцом" вырваны былі з рамамі. Чаго не было ў вагонах? Банкі з-пад кансерваў, кучы смецця ды саломы, бутэлькі з-пад гарэлкі ды напояў. Як гаварылі працаўнікі чаромхаўскай станцыі, лаўкі і сядзенні не былі надта зруйнаваны. Найбольшыя затраты ў разбітых шыбах, кошт якіх, пакуль што, невядомы. Прымаўка кажа: „Дзе коратка, там рвецца". Гэта праўда. Калі Прадпрыемства рэгіянальных пасажырскіх перавозаў разлічвала на прыбытак з дадатковага транспарту, дык выявілася, што вынік аказаўся адваротны.

А можа арганізатары пакрыюць чыгунцы затраты, учыненыя фанамі рок-фестывалю?

Так ці інакш, клопатаў вагоннай службе хоць адбаўляй, бо матэрыялаў для рамонту вагонаў пакуль што ў Чаромсе і Беластоку няма. А турыстычны сезон у разгары. Чым тады будзем падарожнічаць, калі пяць складаў вагонаў трэба рамантаваць?!

Уладзімір Сідарук

Не бойцеся негра на мяжы

Фота МІКОЛЫ ВАЎРАНЮКА

Браян Скот (другі справа) сярод удзельнікаў Беларускіх трыялогаў на мусульманскіх могілках у Крушынянах

Амерыканскія негры на мяжы з Беларуссю! — падняў гевалт Аляксандр Лукашэнка.

Ну, думаю сабе, амерыканцы нічуць не навучыліся шпіёніць з часоў халоднай вайны. Памятаеце гісторыю са шпіёнам, якога скінулі на Закарпацце? Закапаў ён парашут, пераапрануўся ў вышываную кашулю і парцяныя нагавіцы ды ўваходзіць у вёску. А там на лавачцы дзед глядзіць за грамадкай унукаў. „Слава Ісусу Хрысту", — павітаўся шпіён і папрасіў вады напіцца. Потым пачаў яе расхвальваць на чыстай украінскай мове, што, маўляў, такая добрая як у Дняпры. „Ты мусіць будзеш амерыканскі шпіён", — перабіў яго стары. „Ну што вы, дзеду!? Адкуль вам такое прыйшло ў галаву?" — абрушыўся шпіён. А дзед на тое: „Колькі жыву на свеце, не чуў, каб так добра па-нашаму негр гаварыў".

Не паспеў я аднак пасмяяцца з прыгаданай гісторыі, бо глянуў на дату заявы: 1 жніўня. Халодны пот зрасіў мне лоб, а мурашкі прабеглі па спіне туды і назад. То ж Лукашэнка паскардзіўся старэйшаму брату і з-за мяне. Мой ты Божа, скандалы ў журналісцкім жыцці не навіна, але яшчэ ў такім міжнародным то я ўдзелу не прымаў.

На польска-беларускай мяжы сапраўды некалькі дзён раней быў негр. Разам з Кракаўскім аддзяленнем Польскага тэлебачання здымалі мы падчас „Беларускіх трыялогаў" фільм пра Сакрата Яновіча. У здымачнай групе быў Браян Скот — чарнаскуры журналіст, вядучы тэлепраграму „Этнічныя кліматы". Крынкі, як вядома, побач мяжы, дык і мы, стараючыся паказаць атмасферу Малой айчыны Сакрата Яновіча, раз-пораз напорваліся на слупы з лаўрова-збажовымі гербамі. Мала таго, начавалі ў хаце ля маляўнічай даліны рэчкі Нятупы. Другі схіл даліны — гэта ўжо Беларусь. І так тры дні. Нічога дзіўнага, што наш Браян мог у рапартах беларускіх пагранічнікаў размножыцца. А пакуль тыя рапарты дайшлі да Мінска, то і мундзір амерыканскага рэйнджэрса апрануць.

Добра ўсё-ткі, што мы паспелі з'ехаць з Крынак без адзінага стрэлу. Але, што будзе, калі Браян Скот зноў з'явіцца ў нас, пры нагодзе рэалізацыі чарговай серыі „Этнічных кліматаў"?

У сувязі з гэтым мая гарачая просьба да нашых верных чытачоў, якія маюць непасрэдны доступ да Першага Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Перадайце яму асабіста, што Браян Скот ніякі не амерыканец, а патомак бедных нявольнікаў з Брытанскай Гаяны. Ніколі ў жыцці не трымаў ніякага пісталета, адно мікрафон. Беларусь, беларусаў і беларусак любіць і паважае. Не бойцеся яго.

І не страляйце да журналістаў ля мяжы!

Мікола ВАЎРАНЮК

Я нядаўна на сустрэчы з расіянамі расказаў адно здарэнне. Калі мы нядаўна ў Брэсце праводзілі семінар з кіраўнічымі кадрамі, прыехаў кіраўнік нацыянальнага запаведніка „Белавежская пушча", якая знаходзіцца на граніцы з Польшчай, і папрасіў мяне тэрмінова прыехаць, паколькі ёсць праблема, звязаная з бяспекай. Ён выкладае мне факты і паказвае дакументы: негры на граніцы Польшчы і Беларусі, ваенныя негры, амерыканцы. Скажыце, што яны за сотні тысяч кіламетраў робяць на польска-беларускай граніцы? Зразумела што. Мы, канешне, на гэта рэагуем і будзем рэагаваць адэкватна. Потым кладуць мне на стол фатаграфіі. Цераз кожныя 25-30-50 кіламетраў устаноўлены самыя сучасныя пункты назірання: вышка, высока над дрэвамі, не скрываючы пры тым, электроннае абсталяванне, якое ўсю тэрыторыю Беларусі праглядае.

Са стэнаграмы прэс-канферэнцыі Аляксандра Лукашэнкі для расійскіх СМІ ад 1 жніўня 2003 г.

У Мінску як у чэшскім фільме

Последнее время... Ой! Не так. Яшчэ раз: апошнім часам давялося мне быць у горадзе Мінску — сталіцы прыгожай, цудоўнай, адзінай у свеце беларускай дзяржавы.

Аднак усё, з чым я там сустракаўся, больш асацыюецца мне з іншай краінай, менавіта Чэхіяй, а дакладней з чэшскім фільмам, падчас якога ніхто не ведае ў чым справа.

Чалавечую фрустрацыю могуць выклікаць нават, здавалася б найбольш банальныя справы. Вось, напрыклад, такі душ... Малады чалавек, які пасля дзевяцігадзіннага падарожжа хоча захаваць астаткі чыстасці, думае толькі пра дзве рэчы: адпачынак і ваду. Кіруецца ён (значыць я) у адпаведнае месца. Распранаецца. Праз хвіліну ён будзе ўжо чысты, чысцюсенькі. Будзе адчуваць сябе намнога лепш чым астатнія, якія чакаюць у чарзе. Адкручвае ваду і... нічога! На яго галаву не пацячэ ні адна кропля! Злосць гэта найбольш лагоднае слова, якое можа акрэсліць стан, у якім знаходзіцца такая асоба. Пасля аказваецца: вада ёсць ад 8-й гадзіны вечара, цёплая — ад 10-й. Цікава ці ў туалеце ваду таксама рацыянуюць?! Чэшскі фільм і ўсё!

Сняданак. Рэстаран на немалым узроўні. У параўнанні да ўчарашніх прыгодаў з душам — люксус. Афіцыянтка — дзяўчына ў студэнцкім узросце — за паднесеныя харчы ад усіх чуе згоднае ,,дзякуй''. Відаць, дадумалася, што мы — ,,инностранцы'', дык пытаецца: «Скажите ещё, как будет на польском языке ,,пажалуйста''». Я ачмурэў. Чэшскі фільм прадаўжаецца: усведамляй беларуса, што ты да яго гаворыш на беларускай, а не на польскай мове. Небыліца.

Сустрэча ў гімназіі. Урачыстае прывітанне, хлеб ды соль, вакальна-інструментальны ансамбль. Усё цікавае (перш за ўсё гімназісткі). Даходзіць да дыскусіі. Ужо першыя пытанні — доказ на тое, што і тут чэшскі фільм мае свае ўплывы: вы як палякі... мы як беларусы. Што ж зрабіць, трэба ўсё тлумачыць. А што нават па-за межамі краіны актыўнасць падляшскіх вучняў, з якой можна сустрэцца падчас школьных аўтарскіх сустрэч, не мяняецца, уся адказнасць скінута на дзве асобы (у тым ліку і на мяне сціплага). Ясная справа, як заўсёды ў такіх выпадках трэба адказаць на вельмі важнае экзістэнцыяльнае пытанне: ,,Калі вашы продкі выехалі з Беларусі?''

Аднак атмасфера родам з чэшскага фільма расцягнулася і на наступныя здарэнні. Дастаткова ўспомніць дзве гадзіны свабоднага часу, праведзенага на праспекце Скарыны. Першая справа для турыста, які глядзіць тэлевізар, гэта пабачыць Савет Дэпутатаў. Пасля некалькіх здымкаў пераходзім насупраць, пад помнік Леніну. Дык вось пачынаюцца праблемы, бо навокал правадыра рэвалюцыі ходзіць міліцэйскі, які не дазваляе падысці надта блізка. Цікавая праца: ходзіць цэлы дзень вакол аднаго манумента. Аднак большай праблемай аказваецца высвятленне, што знаходзіцца ў будынку за Ленінам. Яго не спытаешся, міліцыянта таксама нязручна. Астаецца толькі папрасіць дапамогі ў першай напатканай асобы. У гэтым месцы пачаў я шкадаваць, што не да канца ўважаў на ўроках рускай мовы, бо з тлумачэнняў спы-танай намі дзяўчыны не зразумеў амаль нічога.

Ад чэшскага фільма хацеў я ўцячы ў музычную краму. Як думаеце, пра што можа пытацца фанат беларускай рок-музыкі ў родным горадзе Уліса, Н.Р.М. ды іншых вялікіх зорак беларускай эстрады? Ведаючы, што справа не мусіць быць так простай, паспрабаваў я запытацца вельмі дыпламатычна. Менавіта сказаў я, што хачу пабачыць CD беларускамоўных выканаўцаў. Пасля добрых 10 хвілін кабета выграбла мне з самага нізу нейкую касетку з мінскай папсай. Якое было здзіўленне і злосць, калі я падзякаваў і выйшаў, не купіўшы нічога.

Прызнацца мушу, што ў пэўны момант атмасфера чэшскага фільма прыбіла мяне так, што я ўжо не падняўся. Вечар, заязджаем у месца, дзе мелі мы трошку пагуляць на дыскатэцы. Уваходзім, чуем ужо музыку. Але... сустракае нас тутэйшая спадарыня экскурсавод і... замест захапляцца рытмамі музыкі, мусім глядзець акварыумы. Дасканала! Рыбкі замест дыскатэкі! У вушах чую ўжо толькі мову нашых паўднёвых суседзяў.

Вось і ў тым справа. Сітуацыя ў Рэспубліцы Беларусь такая складаная, бо ніхто нічога не разумее. Калі б я таксама жыў у чэшскім фільме цэлае жыццё, я зусім не звяртаў бы ўвагі на палітыку ці нейкія чалавечыя правы. Навошта, калі і так невядома ў чым справа. Ano!

Міхась СЦЕПАНЮК

Ад узаемных інтарэсаў — да канкрэтных праектаў

Фрагмент інтэрв'ю пасла Рэспублікі Беларусь у Польшчы Паўла ЛАТУШКІ для газеты „Рэспубліка" ад 29 ліпеня 2003 г.

— Як вы ацэньваеце цяпершані стан гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва?

— У мінулым годзе ўзаемны тавараабарот склаў каля паўмільёна долараў ЗША. У гэтым за студзень — красавік дасягнуў 234 млн. дол. І ўсё ж хачу крытычна падысці да гэтай лічбы: яна не можа задавальняць абодва бакі.

— З уступленнем Польшчы ў Еўрасаюз узнікнуць дадатковыя праблемы, якія могуць паўплываць на далейшае расшырэнне двухбаковага супрацоўніцтва?

— Безумоўна. І найбольш вострая праблема — неабходнасць перагляду ўсёй двухбаковай дагаворна-прававой базы гандлёва-эканамічных адносін. Істотным фактарам спыняючым развіццё беларускага экспарту можа стаць змена ў гандлі калійнымі ўгнаеннямі. Польшча з мая 2004 г. пачне прымяняць антыдэмпінгавыя меры Еўрасаюза. Пацерпяць і такія нашы тавары, як хімічныя валокны, жгут, тканіны. Таму ўжо цяпер нам неабходна прааналізаваць паслядоўнасці з тым, каб змякчыць іх адмоўны ўплыў на гандаль з Польшчай.

Слабыя пазіцыі беларускага экспарту па некаторых таварах на польскім рынку абумоўлены таксама наступным. Экспартныя цэны нашых тавараў высокія, фінансавыя механізмы разлікаў абмежаваны. Гэта прыводзіць да страты канкурэнтаздольнасці па цэнавым фактары. Усё яшчэ недастатковая актыўнасць беларускіх прадпрыемстваў і фірм, слабая маркетынгавая работа на польскім рынку. Аднак лічу, што ў бліжэйшыя некалькі гадоў рэальна павялічыцца тавараабарот паміж нашымі дзяржавамі да аднаго мільярда долараў.

— Лёгка назваць такую лічбу, але як яе „адолець"?

— Па-першае, мы можам і павінны выкарыстаць каштоўны вопыт нашых двухбаковых адносін з Расіяй. Справа ідзе аб актыўных рэгіянальных сувязях. Неабходна хутчэй устанаўліваць кантакты на ўзроўні кіраўнікоў ваяводстваў Польшчы і абласцей Беларусі. Шырэй прыцягваць да сустрэч прадстаўнікоў бізнесу, прадпрыемстваў, гандлёва-прамысловых палат, саюзаў прадпрымальнікаў.

www.mfa.gov.by

Замест на працу, 10 тысяч прадалі

Новыя нявольнікі

Мы не Джэймсы Бонды, якія адбіваюць жанчын з бардэляў, — кажа Ірэна Давід-Ольчык з фонду *La Strada*, незалежнай няўрадавай арганізацыі, якая дзейнічае ў Польшчы ад 1996 года.

Рэкламная паштоўка фонду La Strada: „Ніколі не ведаеш, куды сапраўды даедзеш...”

Атракцыйная на выгляд праца ў агенцтве мадэляў ці сезоннае збіранне трускалак можа стаць кашмарам. Каля 10 тысяч жанчын з Польшчы штогод прадаецца ў публічныя дамы на захадзе Еўропы.

Фонд супраць гандлю жанчынамі *La Strada* супрацоўнічае з іншымі арганізацыямі супрацьдзеяння гандлю людзьмі ў свеце, з паліцыяй і пракуратурай. Справы, якія ўдаецца ім адкрыць і памагчы вызваліць людзей ды пакараць гандляроў, гэта толькі вяршок айсберга. Тым больш, што займаецца гэтым некалькі чалавек валанцёраў. Супрацоўніцтва з лакальнай і цэнтральнай паліцыяй толькі пачынае зладжвацца, а пакрыўджаным, шантажыраваным, ад страху і няведання законаў, мовы, бездапаможным, вельмі рэдка ўдаецца атрымаць дапамогу, уцячы з няволі і давесці да судовае справы іх крыўдзіцеляў.

Гандляры набіраюць ахвяры з дапамогай аб'яў у прэсе. Прапануюць добрую, цікавую працу ў агенцтвах, рэстаранах, барах. Здараецца, што жанчын, якія адказваюць на запрашэнне, пасля прыезду на месца працы, б'юць, забіраюць пашпарт, прымяняюць шантаж. Пракуратура абвінавацілa жыхара Чаромхі Яраслава Д. і жыхара Падкарпацкага ваяводства Януша О. у гандлі людзьмі. Абяцалі тром дзяўчатам працу ў бельгійскім бары. У той час семнаццацігадовай Юстыне Б., якую першы сустрэў на дыскатэцы, запрапанаваў выезд у Бельгію (вельмі часта гандляр уваходзіць у псіхічную сувязь з будучай ахвярай, „улюбляецца” ў яе). Жанчын, пасля прыезду, калі бунтуюцца, гвалтуюць, часам паказна для іншых, адбіраюць пашпарт. Палохаюць, што пра тое, чым яны займаюцца, распавядуць у іх мясцовасці, у школе, на працы ў краіне, што прададуць іх жорсткай албанскай мафіі.

Пры вярбоўцы жанчынам прапануецца працу манекеншчыц, кухарак, барменак, танцорак, нянек, збіральніц пладоў. Асабліва папулярныя славянкі. У Францыі рускіх прастытутак больш за ўсё ў Парыжы, у Канах і Ніцы. У Грэцыі дзейнічаюць цэлыя сіндыкаты сексбізнеса, якія вярбуюць работніц ва ўсёй Расіі. Вызваліцца ад сексуальнага рабства практычна немагчыма без дапамогі звонку.

Гандаль людзьмі ў свеце датычыць не толькі жанчын, а і мужчын ды дзяцей для цяжкай нявольнай працы, жабрацтва, гандлю органамі, прастытуцыі. Штогод перапраўляецца за межы каля 1,2 мільёна дзяцей за суму 10 мільярдаў долараў, як інфармуе ў рапарце Фонд аб'яднаных нацый дапамогі дзецям (UNICEF). Кантрабанда мае глабальны характар і датычыць усіх краін. Справа кантрабанды дзяцей трапіла на першыя старонкі брытанскіх газет, паколькі тамтэйшая паліцыя арыштавала 21 асобу ў сувязі з рытуальным забойствам нігерыйскага хлопчыка. Ягоны пазбаўлены галавы і канечнасцей корпус вылавілі ў Тэмзе два гады таму. Паліцыя лічыць, што быў ён украдзены ў Вялікабрытанію.

Рапарт UNICEF падкрэслівае, што вялікі рынак гандлю дзецьмі гэта Еўропа, а крыніца забеспячэння — Заходняя Афрыка і Усходняя Еўропа. У гэтых рэгіёнах і ў Азіі гандаль дзецьмі — квітнеючы бізнес. У Еўропу штогод перапраўляецца паўмільёна дзяўчат і маладых жанчын, якія паходзяць з усяго свету, галоўным чынам аднак з былога СССР. Цана жанчыны на пачатку кантрабандысцкага шляху ў любой румынскай мясціне гэта каля пяцідзесяці долараў. З Заходняй Афрыкі вывозіцца штогод каля 200 тысяч дзяцей, якія „экспартуюцца” ў Еўропу або прадаюцца як нявольнікі да хатніх прац у іншых афрыканскіх краінах. Дзеці выкарыстоўваюцца таксама ў жабрацтве. Аднак трэцяя частка лакальнага і міжнароднага гандлю жанчынамі і дзецьмі прыпадае на Паўднёва-Усходнюю Азію. На працягу трох апошніх гадоў дзіцячая прастытуцыя ў Тайландыі ўзрасла на 20%, а 15% дзяўчат вывожаных з В'етнама не мае 15 гадоў. У Кітаі ахвярамі кантрабанды становіцца штогод 250 тысяч жанчын і дзяцей. Гандаль не абмяжоўваецца толькі да жанчын і дзяўчат. Тысячы хлопцаў, часам ужо ў 5-гадовым узросце, вывозяць штогод са Шры Ланкі, Індыі, Пакістана ў Задзіночаныя Арабскія Эміраты, дзе займаюцца наезджваннем вярблюдаў. Займаюцца промыслам цэлыя міжнародныя групы, напрыклад, у Польшчы гэта албанская (крывавая) і малдаўская мафія, былі групы ромска-румынскія, балгарскія.

Прычыны, якія спрыяюць гэтаму промыслу — бяда, беспрацоўе, глабалізацыя (вялікія розніцы паміж паасобнымі часткамі свету), збройныя канфлікты, некаторыя звычаі. Вельмі лёгка прадаць жанчыну ў адчаі, бедную, безабаронную, у чужой краіне, якая не ведае мовы, закона, упэўненую ў карумпаванасці паліцыі і судоў. Часта, калі ўдасца ёй уцячы ад гандляроў, паліцыя дэпартуе яе, не цікавячыся яе сведчанням аб тым, хто яе няволіў. Прымусовае выкарыстоўванне людзей трактуецца законам як ламанне правоў чалавека. Але вельмі часта, пакуль суды пакараюць рассакрэчаную злачынную групу, сведку, нават у сваёй краіне, пад аховай паліцыі і судоў, трывожаць разам з сям'ёй, пагражаюць яму смерцю. Моніка, украінка, якой удалося памагчы Ла Страдзе, была ў сябе арыштавана па фіктыўнай справе. Удалося яе, аднак, прывезці ў Польшчу, дзе дала паказанні ў судзе.

Міра Лукша

Mea maxima culpa

Не вер жонцы дома, а каню ў дарозе, гаворыць старая прыказка. Коней пад-мянілі машыны, але і ім нельга давяраць. А я, вось, рыхтуючы для друку папярэдні нумар „Нівы”, дапусціўся гэтага недагляду, у выніку чаго рэдакцыйныя машыны спадцішка ад мяне выпусцілі на друкарскую кальку брак. Як у легендзе пра круглы стол брытанскага караля Артура некаторыя прапісныя літары на 4 ста-ронцы памяняліся месцамі, быццам Артуравы рыцары, а на 10 старонцы літарку „н” падмяніла „І”. І атрымаліся там тэксты крыху зашыфраваныя, падобныя ні то на здзек, ні то на свайго роду галаваломкі. І хаця расшыфроўка іх не надта складаная, усё ж такі мне балюча прыкра за дапушчаную мною празмерную даверлівасць да „сумленнасці” сучаснай тэхнікі. Каюся, а ў аўтараў, іх герояў і ўсіх нашых чытачоў прашу прабачэння.

Аляксандр Вярбіцкі

Музей кавальскага і слесарскага рамяства

На адкрыцці Музея кавальскага і слесарскага рамяства ў Гайнаўцы, якое адбылося 25 ліпеня, прысутны былі прадстаўнікі павятовых і гарадскіх улад. Бляшаную стужку дапамагалі перарэзаць намеснік старасты Ежы Сірак і інспектар па справах культуры ў магістраце Яўгенія Марчук.

Станіслаў Мяжвінскі, стваральнік прыватнага кавальскага і слесарскага музея, распаложанага па вуліцы Ліповай 1, спаслаўся на сямейныя кавальскія традыцыі. У 1927 годзе ў Гайнаўку прыехаў яго дзед Станіслаў Мяжвінскі і на арандаваным ад Гайнаўскага надлясніцтва ўчастку адкрыў прыватную кузню. У 1936 годзе пераняў яе сын Баляслаў Мяжвінскі і да 1938 года збудаваў новы мураваны будынак, у якім зараз знаходзіцца музей. Унук Станіслаў Мяжвінскі навучыўся кавальскай прафесіі, але заняўся слесарствам. У 2000 годзе ў яго кузні была арганізавана выстаўка кавальства. Нядаўна атрымаў фінансавую дапамогу размерам у 7 тысяч злотых з Праграмы ўспамагання мясцовых ініцыятыў рэалізаванай Гайнаўскім старостам у супрацоўніцтве з Бюро праекта „DANCE” і рашыўся адкрыць музей.

— Адкрываючы Музей кавальскага і слесарскага рамяства, хачу паказаць развіццё кавальства, пачынаючы ад другога стагоддзя да нашай эры, — заявіў Станіслаў Мяжвінскі.

У выставачнай зале знаходзіцца керамічная печ — „дымарка”, збудаваная паводле музейных макетаў. У такіх печах у старажытнасці выплаўлялі жалеза. Побач яе знаходзяцца кавалкі жалезнай руды, прывезеныя са Свентакшыскіх гор, і здымкі, на якіх паказваецца праца кавалёў у старажытнасці. Сельскагаспадарчы музей з Цеханоўца перадаў ў новаадкрыты музей старыя кавальскія вырабы. У галоўнай выставачнай зале можна пабачыць металаапрацоўчыя станкі, выкананыя ў міжваенны перыяд, і старыя слесарскія прылады. У старой кузні, распаложанай непадалёк ад выставачнай залы, знаходзіцца кавальскі варштат працы, якім карыстаўся бацька Станіслава Мяжвінскага. Няма там электрычнасці, а патрэбная

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Станіслаў Мяжвінскі ў старой кузні

да кавальскай працы энергія атрымлівалася ад працы рук.

— Ад верасня будзем паказваць музей для школьнікаў Гайнаўкі і навакольных мясцовасцей. У маі наступнага года плануем пашырыць музейную выстаўку на панадворак. Хочам з дапамогай Археалагічнага музея з Варшавы паказваць выплаўліванне жалеза ў дымарках. Варшаўскі музей выканае мне копіі старажытных кавальскіх прыладаў, якімі будзем карыстацца, — праінфармаваў Станіслаў Мяжвінскі. — Раней каваль быў праўдзівым спецыялістам і служыў людзям. Кавальскія вырабы неабходныя былі ў штодзённым жыцці. Хочам, каб з працай каваля пазнаёміліся маладыя.

Музей кавальскага і слесарскага рамяства адкрыты з аўторка па суботу ад дзевятай гадзіны да васемнаццатай і ў нядзелю ад дзесятай гадзіны да васемнаццатай.

Аляксей Мароз

Зорка

старонка для дзяцей

Юрась Свірка

Жнівень

Шчодры жнівень замыкае лета:
Завяршыў мурожныя стагі,
Песнямі птушынымі сагрэты
Водзіць развітальныя кругі.
Там, дзе белы мох,
І там, дзе верас, —
Выпасы тугіх баравікоў.
Лес ніколі не зачыніць дзверы,
Запрашае ў госці грыбнікоў.
Час такі жаданы, незабыўны,
Ружавеюць крохкія плады.
Выйдзі і паслухай ноччу жніўнай,
Як скрыпяць ад яблыкаў сады.
Туманы дымяцца на лагчынах,
Беляць разасланыя ільны.
І паверыць нават немагчыма,
Што ўжо крокі восені чутны.
Ды напомніць жураўліны голас
Пра адлёт, што кліча ўдалячынь.
І да верасня, і да званка ў школе
Лёгка дні на пальцах палічыць.
Жнівень за аблокамі знікае.
І яму пара ўжо адпачыць.
Ён спакойна лета замыкае,
Верасню даверыўшы ключы.

Фота ЯНКІ ЦЕЛУШЭЦКАГА

Наталька Харкевіч і Дамініка Раманюк з сёлетнімі грыбамі

Ніна Мацяш

Ворлікі

Ворлікі-лілейкі
дружнаю сямейкай
зранку на паляначку
выйшлі, бы цыганачкі.

Стоўпіліся густа
у шаўковых хустах —
сініх, фіялковых,
белых ды ружовых.

Арабінцы гожай
долечку варожаць.

Вершы Віктара Шведа

Капернік

На геаграфіі ўроку
Спытаў настаўнік незнарокам:
— Хто там так круціцца няспынна,
Муціць спакойныя хвіліны?

— Зямелька — нашая планета.
— Прызнайцеся, — сказаў, — хто гэта?
Крыкнуў з апошняй парты Фома:
— Капернік жа сказаў, вядома.

Яўген-„спартсмен"

Лекар запытаў Яўгена:
— Ці з'яўляешся спартсменам?
— Нахіл спартыўны маю яркі,
Паштовыя збіраю маркі.

— Патрэбны спорт тваім аортам,
Што ж тут супольнага са спортам?
— Збіраю маркі па загаду, —
Спартыўныя ўсе алімпіяды.

Уладзімір Скарынкін

Пад ялінай

Пад ялінай ля камля
Зварухнулася зямля.
І лісічкі-весялушкі
Паднялі адразу
вушкі.
Разважаюць:
Што за цуд?
Што за звер схаваўся тут?
Можа гэта робіць крот
Пад зямлёй таемны ход?
Можа гэта чарвякі?
Можа, проста жук які?
Гэта ж іхні сваячок —
Таўсцячок-баравічок.

Польска-беларуская крыжаванка № 34

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Księżyc / Wieczornica	▼	Czytelnik	▼	Kanada	▼	Dłuto	▼	Pająk
▶		▼						Placek
Syn / Mięta	▶			Sowa	▶			▼
▶				Wzrok		Lama		
Sitko / Sok	▶			▼		▼		
▼	Kieliszek	▶					As	
▶					Mak	▶	▼	
	Ob	Ozdoba	▶					

Адказ на крыжаванку н-р 30: Гарох, вол, камар, заранка, казачнік, парк, баабаб. Густ, каб, зара, казка, хмара, мачта, ванна, горкі, акно.

Узнагароду, **аўтаручку**, выйграла **Анджэліка Сельвясюк** з Бельска-Падляшскага. Віншуем!

Як маці сына пракляла

(Беларуская народная казка)

Жылі-былі маці і бацька і быў у іх сынок-падшпарак. Вечарам калі гаспадары ўправіліся і павячэралі, сталі рукадзеллем займацца. Бацька лапці сплятаў, маці кудзелю прала. Прала яна, прала і... заснула. Глянуў гаспадар і прыдумаў фокус.

— Штурхані матку, — падмовіў ён сынка, — хай не спіць, хай прадзе!

Падбег малы да маці і тыц яе паленцам.

Гаспадыня як спала, так і сарвалася.

— А каб на цябе бура! — крыкнула яна. — А каб ты ў дзень свайго вяселля прапаў!

Прайшло шмат часу. Ужо і сына жаніць трэба. Наладзілі вяселле, павянчаліся маладыя, усё як трэба. Маладую прывезлі, ідзе яна дахаты, ручнікі на іконах вешае. Тым часам малады выйшаў з хаты і... прапаў.

Адзін год мінуў, другі, трэці — няма сына. Чаго не рабілі бацькі — да чараўнікоў ездзілі, па гадалках, што карты ставяць. Усе адно кажуць — сын жывы. А дзе шукаць — ніхто не ведае.

Аднойчы на змярканні жабракі прыйшлі. Прынялі іх бацькі нанач. Раніцай, перад дарогай, жабракі пытаюць:

— А гэтая дзяўчына, дачка ці нявестка?

Расказалі пра гора бацькі. Як сын у час вяселля прапаў. А калісь быў такі закон, што як павянчаюць маладых, жонка ў мужа астаецца. Хоць муж памрэ, усё адно, яна астаецца. Пачулі аповед вандроўнікі, падумалі, ды кажуць:

— Ваш сын жыве! Ідзіце ў лес на паляну. На паляне дом стаіць, з жалезнай агароджай. У гэтым доме ніхто не жыве, толькі ноччу, у дванаццаць гадзін, прыязджае хлапец на кані. У хаце белая печ. Ён выграбае з печы жар і корміць каня. Конь есць вугаль, а хлопец кнігу чытае. Там напісана: „Па волі бацькі, па пракляцці маткі — усё жыццё будзеш бадзяцца". Прачытае запавет маладзец, сядзе на каня і з'язджае з двара.

— Відаць, гэта наш сын будзе, — думаюць бацькі.

І вось, рашылі паляну адшукаць. Першым падаўся бацька. Хадзіў ён па лесе, хадзіў і знайшоў паляну ды дом. Сеў і чакае. У дванаццаць га-

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Марыся

Дэкламатары любяць аўтараў „белавежцаў". Яны прысутныя на кожным аглядзе. Швед, Артымовіч, Гайдук, Баена, Шатыловіч...

Марыся Сідарук, гімназістка з Ягуштова, падрыхтавала верш Алеся Барскага „Ёсць на свеце зямля".

Паэтычнасць твора і роднасць краявідаў, а таксама дбайнае выкананне далі цікавы эфект. Марыся стаяла далёка ад мікрафонаў і таму не ўсе, асабліва публіка ў апошніх радах, змаглі палюбавацца прыгажосцю верша.

Алесь Барскі як ніхто ўмее паказаць прыгажосць нашай зямлі.

Зорка

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Марта

Сярод малодшых дэкламатараў у конкурсе „Роднае слова" выступіла Марта Вайцюк. Дзяўчынка падрыхтавала верш Кастуся Цвіркі „У кнігарні".

Марта, хаця дробненькая і маленькая, бойка выступіла на сцэне. Дэкламатарка вельмі старанна перадумала змест верша, паасобныя фрагменты верша прагучалі кантрастна — раз яны струменілі пачуццямі, іншы раз панаваў апавядальніцкі стыль.

Марта Вайцюк — вучаніца Пачатковай школы н-р 3 у Бельску-Падляшскім. Яна лаўрэатка трэцяга месца ў цэнтральным конкурсе „Роднае слова".

Зорка

дзін прыязджае сын. Прывітаўся з бацькам, прачытаў запавет, каня жарам накарміў і ад'язджае. Бацька кажа:

— Я з табою паеду!

— Не, не паедзеш, трэба тры агні пераехаць, тады мяне выпусцяць, а ты — згарыш.

Бацька згадзіўся. Селі ўдваіх на каня і паехалі. Пераскочылі першы агонь, стары ледзь не загінуў, ад агню барада ды валасы на галаве загарэліся. Бачыць ён, што далей нельга і кажа:

— Сынок нельга мне далей! — і вярнуўся.

Прыехаў бацька ў двор, расказаў маці і нявестцы.

— Цяпер я паеду, — рашыла маці. Яна адшукала паляну і дом. Села і сядзіць там. Прыязджае апоўначы сын, накарміў каня, кнігу чытае:

— „Па бацькавай волі, па пракляцці маткі ўсё жыццё бадзяцца буду".

Маці на тое:

— Я паеду з табой і выратую цябе.

Селі яны на каня і паехалі. Пераехалі два агні — маці ўмірае. Злезла з каня, вярнулася ў дом. Цяпер жонка кажа:

— Я пайду.

Пайшла яна ў лес, знайшла паляну. У дванаццаць гадзін муж прыязджае. Прывітаўся, прачытаў кнігу, накарміў каня і ад'язджае:

— Я паеду з табой.

— Не, ты загінеш!

— Ну, дык загіну, — усё адно з табой паеду.

Селі яны на каня і паехалі. Адзін агонь пераехалі, другі, трэці. Жонка жывой асталася. Пасля ўсяго хлопец кажа:

— Цяпер я стану галубком і палячу ў палац. А ты шукай мяне. Прыйдзеш у першы палац — там будзе многа галубоў хадзіць. Скажуць — выбірай! Ты паглядзі і ўцякай, мяне там не будзе. Ідзі ў другі палац. Я туды палячу.

— А як жа ж я цябе адшукаю?

— Я буду лапкай дзюбку дзерці і па гэтым мяне пазнаеш.

Пайшла маладая жонка ў першы палац, абышла ўсе птушкі і кажа:

— Няма тут майго галубка.

Пасылаюць яе ў другі палац. Прыйшла, ходзіць, шукае. Хадзіла яна, хадзіла аж бачыць — адзін галубок адышоў на бок і лапкаю дзюбку дзярэ.

— Вось мой галубок! — схапіла яго ў рукі дзяўчына.

І ўсё адвярнулася. Галубок зноў стаў чалавекам.

А як вярнуліся маладыя да бацькоў, яшчэ раз вяселле згулялі.

(гак)

Воўчае сяброўства

На лясной палянцы жыла сям'я зайчыкаў. Дружна яны пажывалі, запрашалі да сябе гасцей, госці прыходзілі да іх. Але хутка набліжалася свята — самы старэйшы хлопчык-зайчык павінен быў пайсці ў школу, у першы клас. Гэта было свята для ўсёй сям'і. Мама-зайчыха ўстала рана, падсмажыла капуснае лісце, хлопчык-зайчык хуценька паеў і пайшоў у школу з вялікім-вялікім качаном капусты ў руках. Дзень выдаўся сонечны, цёплы. Хораша было на душы ў зайчыка — ён жа ішоў першы раз у школу!

Школа стаяла на лясной палянцы. Агледзеўся зайчык: як тут прыгожа, сонечна, весела! А колькі сабралася школьнікаў-зверанят?! Выйшаў дырэктар школы, строгі і высокі лось. Усе вучні-звераняткі сталі ў лінейку. Дырэктар сказаў прамову, потым запрасіў усіх у клас. Зайчык забег у свой першы клас і о... усе месцы заняты!

— А дзе ж сесці мне? — разгублена запытаў ён. І тут заўважыў адну пустую парту, хуценька падбег і сеў. Сумна стала яму, што будзе сядзець без таварыша.

Зайшоў важны настаўнік-бабёр і заняў сваё месца за сталом. Хвілінку-другую ён памаўчаў, падумаў, паглядзеў на вучняў сваімі строгімі вачыма, а потым сказаў зайчаняці перасесці за першую парту. І... о, тут жа сядзела — хто б вы думалі? — ваўчаня, якога зайчык баяўся больш за ўсіх на свеце. Ён увесь затросся і так спалохаўся, што не мог вымавіць і слова. Але не па сваёй волі пайшоў і сеў за парту да ваўчаняці. Тое лагодна зірнула на зайчаня, і сэрца ў яго перастала спужана стукаць. Настрой у яго падняўся, і ўрокі хутка закончыліся. Выбег зайчык на парог школы, а тут яго чакала ваўчаня. Яно сказала, што яго бацька важны міністр і прыедзе за ім на машыне. Калі зайчык хоча, то яны і яго падвязуць дамоў. І праўда, пад'ехаў чорны „мерседэс", і ваўчаня, схапіўшы зайчыка за лапку, хутка пацягнула яго ў машыну.

Стары воўк толькі скоса паглядзеў на таварышаў і падумаў: добрая вячэра будзе сёння. Але сынок-ваўчаня не дазволіў нават пальцам дакрануцца да свайго новага сябра. Давезлі зайчыка да яго норкі-хаткі і высадзілі, хоць стары воўк і аблізваўся.

Непрыкметна праляцеў год вучобы. Ваўчаня і зайчаня гэтак здружыліся, што ва ўсёй школе лепшых сяброў нельга было знайсці. Ваўчаня бачыла, у якой хатцы-норцы жыло зайчаня, і яму было шкада яго вялікую сям'ю. Ваўчанятка стала прасіць свайго бацьку-міністра, каб ён дапамог „выбіць" кватэру для мнагадзетнай зайчыкавай сям'і. Воўк-бацька думаў дзень, думаў другі... і, нарэшце, сказаў свайму сыну-ваўчаняці, каб яго таварыш з сям'ёй перасяліўся ў пусты катэдж насупраць іх.

Заечая сям'я спачатку не паверыла, што воўк можа быць такі добры. Справілі наваселле зайчыкі, і ваўкі-суседзі ў гасцях былі. А праз тыдзень зайчаняці не стала ў школе. Ваўчаня непакоілася, вырашыла зайсці ў госці да таварыша, але хата была зачынена на замок. Пабегала ваўчаня, пабегала, ды нікога не знайшло. Вырашыла спытаць вечарам у свайго бацькі-міністра. Але бацькі доўга не было з работы, а маці, калі ваўчаня прыйшло дамоў, пасадзіла яго есці і падала на стол вараную зайчаціну. „Дзе ж яна ўзяла такое мяса?" — падумалася ваўчаняці. І тут у галаву прыйшла думка: вось дзе падзеўся мой таварыш! Усёй душой зненавідзеў сын-ваўчаня свайго бацьку і назаўсёды вырашыў пакінуць сваю воўчую сям'ю.

Уладзімір Васіленка, 7 кл.,
Дабравольская СШ, Свіслацкі р-н

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Дзіцяча-маладзёжны хор Прыманастырскага прыхода ў Супраслі

Харысты з Супраслі

Тры гады таму ўзнік дзіцяча-маладзёжны хор Прыманастырскага прыхода ў Супраслі, якім кіруюць протадыякан Дзмітры Ціханюк і матушка Міраслава Ціханюк. Хор спявае ў час царкоўных багаслужэнняў, некалькі разоў выступаў на Беластоцкіх вечарах каляд і Беластоцкіх днях царкоўнай музыкі. У мінулым годзе заняў другое месца ў Міжнародным фестывалі „Дні царкоўнай музыкі" ў Гайнаўцы. У ліку шасцідзесяці яго ўдзельнікаў — многа малых дзетак, якія прывыкаюць да царкоўных багаслужэнняў і праваслаўнага спеву.

(ам-з)

Фота ЯНКІ ЦЕЛУШЭЦКАГА

„Лучына" з „Нараўкі

Фота ЯНКІ ЦЕЛУШЭЦКАГА

Новаарганізаваны жаночы калектыў з Семяноўкі выступіў упершыню

Семяноўка

Фэст на фэст

У Семяноўцы (Нараўчанская гміна) беларускія фэсты адбываюцца 9 жніўня. У гэты дзень тут прыхадское свята Панцеляймона. Сёлета паслухаць канцэрт сабралася шмат народу з Семяноўкі і навакольных вёсак ды прыезджыя з гарадоў.

Публіку прывітаў войт Нараўчанскай гміны Мікалай Павільч. Канцэрт вяла Кацярына Бяляўская з Гміннага асяродка культуры.

Была 17 гадзіна пасля поўдня. Мерапрыемства распачалося выступленнем „Цаглінак" са Старога Ляўкова. Выканалі яны шэсць песень, у тым ліку „Свеціт ясны месяц...", „А ў гародзе ярыца", „Кацілась, кацілась калода з печы" ды „Цякла рэчка пад масточкам". Выступленне суправаджалася гарачымі апладысментамі.

За імі неспадзеўка. На сцэну выйшаў сяміасабовы жаночы калектыў з Семяноўкі, які заснавалі ўсяго два тыдні назад. З ім яго мастацкі кіраўнік Мікалай Мяжэнны з Гродна. Жанчыны спявалі песні „Колькі ў небе зор", „А ў зялёным лесе" і „Пасеялі дзеўкі лён".

Фота ЯНКІ ЦЕЛУШЭЦКАГА

Грае і спявае „Грымата" са Слоніма

„Нараўчанкі" праспявалі шэсць песень. Асабліва запомніліся „Ой, там у полі", „Копаў, копаў крынічэньку", „Гарэла сосна, палала" і „Я малада выйшла замуж".

Усім спадабаўся маладзёжны мешаны вакальна-інструментальны калектыў „Лучына" з Беластока. Так выпадкова склалася, што апрача адной песні пра Яся, які ехаў на кані, усе іншыя пачыналіся ад „ой": „Ой, у полі азярэчка", „Ой, на гары два дубкі", „Ой, на гары дождж ідзе" і „Ой, там каля рэчкі". Выкананне іх было арыгінальнае, цікавае.

Гурты, па ўсяму відаць, упадабалі сабе назву „Лучына". За беластоцкай на сцэну ўвайшла „Лучына" з Нараўкі. Дзяўчаты і хлопцы з Нараўчанскай гміны праспявалі, між іншым, песні „У суботу Янка ехаў ля ракі", „О, Божа, магутны" і „Вяне рута ля прысадаў". Выканаўчая манера маладых спевакоў выклікала зацікаўленне.

Пасля іх з семяноўскай сцэны пад адкрытым небам слухачы пачулі песні „Незабудак" з Курашава (Чыжоўская гміна). Спявалі яны „Як нам замужом жылосе", „За горамі голубы літают", „Крынічэньку" і „Частушкі". Было што паслухаць.

У Семяноўку на фэст прыехаў замежны ансамбль „Грымата" з Беларусі. Прывёз ён з сабою вялікую колькасць беларускіх народных лірычных і жартоўных песень. Цудоўныя галасы, падмацаваныя акампанементам гармонікаў прывялі слухачоў у захапленне. А песні плылі і плылі са сцэны: „Ты грай гармонь", „Добры хлопец ідзе", „На вуліцы грымата", „Гарманіст, гарманіст", „Ой, у лузе пры даліне", „Ой, каліна, ой маліна", „Шыпшына" (беларуская „Смэрэко"), „А ў лесе грыбы зарадзілі", „Ой, кума, ой кума", „Пчолы", „Ой, коцяцца два яблычкі", „Чарка на пасашок". Ірына Бурсевіч спявала сола „Гай зеляненькі" ды гарманісты віртуозна зайгралі „Слонімскую беларускую польку". Артысты шчодра дарылі ўсім прысутным сустрэчу з цудоўным. У „Грыматы", варта адзначыць, вельмі меладычная музыка, якая схіляе публіку спяваць і танцаваць.

Трохгадзінны канцэрт закончыўся выступленнем капэлы з Дубін. У яе рэпертуары вядомыя беларускія песні. На семяноўскім беларускім фэсце сабралася многа людзей. Гэта доказ таго, што імпрэза была патрэбная. Была гэта добрая нагода для папулярызацыі вясковых калектываў і іх аматарскай творчасці.

Калі кончыўся канцэрт, на двары было ўжо амаль цёмна. Арганізатары — улады гміны і БГКТ — запрапанавалі ўсім ахвотным танцавальную вечарыну ў святліцы. Да танцаў іграў калектыў „Аксель".

Янка Целушэцкі

Спасаўскія запусты 2003

Ужо восьмы раз у бельскім амфітэатры адбыліся Спасаўскія запусты, сарганізаваныя Бельскім аддзелам БГКТ і Бельскім домам культуры.

Абрадавую частку, так званую „пэрэпэліцю", прадставіў фальклорны гурт „Арэшкі" з Арэшкава. Жанчыны звязвалі ахапак недакошанага ў час жніва збожжа, якое потым упрыгожвалі кветкамі, а на зямлі, паміж каласкамі, клалі кавалачак хлеба для польнай жывёлы, што мела запэўніць ураджай на другі год і быць падзякай для „матулі зямлі" за збожжа — сімвал жыцця, даўгавечнасці. „Пэрэпэліці" спадарожнічалі народныя песні — жніўныя, любоўныя, аб роднай зямлі і шчасці.

Сярод гасцей Запустаў былі, між іншым, пасол РБ Павел Латушка з сям'ёй, консул Аляксандр Харытонаў і прадстаўнікі бельскіх улад. Публіка, аднак, не была так шматлюднай як спадзяваліся арганізатары. Прычынай гэтаму было незакончанае яшчэ жніво, бо, вядома, што большасць бяльшчан гэта вяскоўцы, і хаця надвор'е не зусім спрыяла працы ў полі (раніцай 10 жніўня выпаў дождж), раз'ехаліся яны па сваіх гаспадарках.

На сцэне выступілі „Васілёчкі" (рэкардсмены бельскай эстрады — існуюць ужо 39 гадоў) з такімі песнямі як „Ты чырвоная каліна", „Ой развівайся дубе", „Чарачка". Потым бельскую публіку да танцаў заахвочвалі „Маланка", мужчынскі хор „Куранты" і капэла „Эва Бэнд". Гасцінна ў бельскім амфітэатры выступіў гурт „Сваякі" з Беларусі.

Спасаўскія запусты традыцыйна рыхтуюць жыхароў Бельска і наваколля да спасаўскага посту — „спасаўкі", і як гаварыў адзін з арганізатараў „жонкі павінны дазволіць сваім мужам выпіць піва, з'есці каўбаску, паслухаць добрай музыкі, а потым, калі прыйдзе пост, востра трымаць у руках". За такой парадай пайшлі амаль усе... І добра, бо і гульні былі, і танцы, а ўсё традыцыйна, як на Спасаўскіх запустах!

Паўліна Шафран

Таварыства прыяцеляў Нараўчанскай зямлі

У красавіку гэтага года пачало дзейнічаць Таварыства прыяцеляў Нараўчанскай зямлі. Старшынёю ТПНЗ з'яўляецца Вольга Зданоўская-Місяюк з Беластока (яна ўраджэнка Нараўкі). Да таварыства належаць не толькі жыхары Нараўчанскай гміны, але і выхадцы ў Варшаву, Люблін, Лодзь, Кракаў і Беласток. Разам 60 чалавек. ТПНЗ прымае ў свае рады новых членаў. Гэтым займаецца член праўлення Алімпія Павільч (тэлефанаваць пад нумар 685 80 50 пасля 17 гадзіны).

18 ліпеня таварыства арганізавала агляд кінафільмаў Тамары Саланевіч (ураджэнкі Нараўкі) у нараўчанскім амфітэатры.

1 жніўня наладзілі ў Гмінным асяродку культуры ў Нараўцы сяброўскую сустрэчу. Зараз у ТПНЗ шмат творчых людзей, актывістаў. Яны будуць арганізаваць выставы прац мясцовых фотааматараў, мастакоў, разбяроў па дрэве і ў гліне. Важнай справай з'яўляецца арганізаванне Рэгіянальнага музея ў Нараўцы. Ужо частку экспанатаў перахоўваюць у Гмінным асяродку культуры.

— Маем адрасы асоб, якія захоўваюць гліняны і драўляны кухонны посуд, між іншым, збаны, гаршкі, міскі, кубкі і лыжкі, — кажа Кацярына Бяляўская, працаўніца Нараўчанскага ГАК. — Некаторыя сяляне маюць яшчэ драўляныя маслабойкі. Яны прывязуць іх у музей. Збіраем усё, што звязана з ткацкай вытворчасцю, ад матавілаў і снаўніц пачынаючы да калаўротаў і кроснаў. Ёсць на тэрыторыі гміны шмат здольных, спрактыкаваных ткачых. Ад іх будзем мець даўнія радзюжкі, дываны, абрусы, настольнікі, а таксама вышываныя ручнікі і макаткі.

У этнаграфічны музей трапяць экспанаты мясцовага ткацтва. Не забракне ў ім таксама ўзораў глінянага посуду з Лукі.

Таварыства мае багатую праграму дзейнасці ў карысць Малой айчыны. Магчыма, што зоймецца яно выдавецкай дзейнасцю. Варта аб'явіць конкурс, сабраць мясцовыя легенды і паданні, а пасля шукаць спонсараў на кніжнае выданне. Можна выдаць манаграфію Стараляўкоўскай парафіі (сабраны ўжо матэрыял).

Янка Целушэцкі

Перад цудадзейнай іконай

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Вернікі ля адрамантаванай Дабравешчанскай царквы

Святкаванні ў гонар Супрасльскай іконы Божай Маці згуртавалі 9 і 10 жніўня ў Дабравешчанскім мужчынскім манастыры шмат вернікаў. У Супрасль прыйшлі пешаходныя паломніцтвы, прыехалі вернікі на машынах і аўтобусах. Людзі маліліся перад цудадзейнай іконай Божай Маці, якая з'яўляецца копіяй Смаленскай іконы ахвяраванай заснавальнікам манастыра мітрапалітам Язэпам Солтанам у 1503 г. Усяночнае багаслужэнне і галоўную літургію ўзначаліў мітрапаліт Варшаўскі і ўсяе Польшчы Сава. На святкаванні прыехалі архіепіскапы Авель з Любліна і Гаўрыіл з Парыжа, епіскапы Іакаў з Беластока, Міран з Гайнаўкі і Грыгорый з Бельска-Падляшскага. Людзі, якія ўваходзілі за манастырскія вароты, адразу глядзелі на Дабра-вешчанскую царкву. Нядаўна закончыўся яе вонкавы рамонт і прыгожа красаваліся ў сонцы пазалочаныя крыжы і Дабравешчанская ікона Божай Маці.

Спачатку вернікі прыкладаліся да вялікай Супрасльскай іконы Божай Маці, перад якой па серадах чытаюцца акафісты. Зна-ходзіцца яна ў храме апостала Іаана Багаслова і таму яшчэ перад вячэрнімі багаслужэннямі гэтая царква была запоўнена вернікамі. Перад іконай чыталіся акафісты, служыліся малебны. Каля іконы вісяць праваслаўныя крыжыкі, ме-дальёны з выявай Божай Маці, чоткі і ружанцы. Пакінулі іх праваслаўныя і каталіцкія вернікі, якія пасля малітваў перад іконай выздаравелі або атрымалі дапамогу ў жыццёвых праблемах. Людзі, якія за зёлкамі і малітвай прыязджаюць да намесніка манастыра, архімандрыта Гаўрыіла, таксама ідуць маліцца перад іконай Божай Маці. Апошнім часам некалькі іншавернікаў пасля малітваў перад іконай рашыліся прыняць праваслаўе. Манахі з Супрасля лічаць, што перадача манастырскіх будынкаў праваслаўным і рэканструкцыя Дабравешчанскага храма таксама адбыліся дзякуючы заступніцтву Багародзіцы. Без дапамогі Божай Маці не было б таксама рашэння аб вяртанні катакомбаў з астанкамі манахаў Супрасльскаму манастыру.

У святкаваннях прысутнічалі прадстаўнікі лакальных улад, якім за рашэнне аб вяртанні катакомбаў падзякаваў епіскап Беластоцкі і Гданьскі Іакаў. Хаця бурмістр яшчэ не рэалізаваў пастановы радных і афіцыйна не перадаў катакомбаў (пастанова не набыла яшчэ законнай сілы), праваслаўным дазволілі адслужыць паніхіду каля астанкаў манахаў (раней трэба было служыць яе каля плота). У час першай і другой Літургій, якія служыліся ў царкве Іаана Багаслова і на могільніку, маліліся пешаходныя паломнікі. Найбольш вернікаў сабралася на Літургіі ў Дабравешчанскай царкве. У час пропаведзей мітрапаліт Сава і епіскап Іакаў вярталіся да гісторыі адраджэння манаскага жыцця ў Супраслі ў 1984 годзе. Успаміналі пра цяжкасці, якія трэба было пераадолець, каб у 1996 годзе атрымаць манастырскі комплекс. Іерархі падзякавалі індывідуальным асобам і ўстановам, якія ахвяравалі грошы на будаўнічыя і рамонтныя работы ў манастыры. Святкаванні закончыў хрэсны ход вакол Дабравешчанскай царквы і малебен, у час якога сабраныя маліліся за манахаў і свецкіх людзей.

Аляксей Мароз

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Святкаванні закончыў хрэсны ход

Супрасльскі паэтычна-гістарычны зборнік

Аляксандра Шэвела — беластоцкая паэтэса вядомая рэлігійнымі вершамі — гэтым разам свой навейшы паэтычны зборнік* прысвяціла Супрасльскай іконе Божай Маці (на здымку). Выйшаў ён у манастырскай друкарні напярэдадні свята цудадзейнай іконы, якое адзначаецца 10 жніўня.

Кніжка розніцца ад тыповых літаратурных зборнікаў наяўнасцю ў ёй матэрыялаў гістарычнага зместу. Зборнік адкрывае нарыс а. Рыгора Сасны пра Супрасльскую ікону Божай Маці, культ якой пашыраецца далёка па-за межы епархіі. Арыгінал іконы падчас першай сусветнай вайны быў эвакуіраваны ў Расію і цяпер месца яе знаходжання невядомае. Вернікі пакланяюцца копіі, якую ў 1987 г. пасвяціў Канстанцінопальскі патрыярх.

Далей даецца падборка з васемнаццаці вершаў, у якіх аўтарка праслаўляе *Белаблакітную, светлатварую* Божую Маці, ад аблічча якой *ззяе ўсцяж бляск спакою, турботы*, якая *жыве ў нашых сэрцах як сястра, як маці* і ад якой *усё наўкол прыгажэе, вырастае*. Паэтэса моліцца, *каб наша вера была броняй і шчытом*, а словы Хрыста — *мурам не да паканання*. У празаічным „Супрасльскім трыпціху" аўтарка апісвае тры жыццёвыя сітуацыі, у вырашэнні якіх дапамогу аказала Супрасльская Божая Маці.

За літаратурнай часткай зборніка прыводзяцца выказванні іерархаў пра ікону і Супрасльскі манастыр. Далей друкуецца каляндар важнейшых падзей з мінулага Дабравешчанскага манастыра, пачынаючы з яго заснавання ў 1498 г. і канчаючы рашэннем урада ад 1996 г. аб перадачы манастырскага комплексу Праваслаўнай царкве. Канчаецца зборнік кароткай энцыклапедычнай інфармацыі пра Супрасльскі манастырскі цэнтр і біяграфічнымі даведкамі пра аўтарку і перакладчыка. Зборнік двухмоўны — пад адной вокладкай даецца польскі арыгінал і беларускі пераклад Віктара Шведа.

(вл)

*Aleksandra Szewełło, *Supraskiej duszy śpiewanie* // Аляксандра Шэвела, *Супрасль-скай душы пяянне*, Białystok 2003, ss. 56 + 56.

Ахвяравальная каплічка

Польныя або прыдарожныя крыжы і каплічкі могуць быць знакамі ўдзячнасці Богу, пакланеннем за задавальненне малітоўных просьбаў, выратаванне ад хва-роб ці няшчасцяў.

Непадалёк Кляшчэль, каля двухсот метраў на ўсход ад дарогі ў Дабрываду стаіць трох'ярусная каплічка васьміметровай вышыні, мабыць са злому XIX-XX стагоддзяў, змураваная з чырвонай цэглы, абтынкаваная, на версе якой красуецца каваны сталёвы крыж з паўмесяцам. У нішы першага яруса памешчаны драўляны крыж, а ў нішы другога — іконка Багародзіцы. Побач каплічкі стаіць таксама вельмі стары і высокі драўляны праваслаўны крыж з „пэрэхрысцем". Усё абгароджана высокім драўляным плотам, месца задбанае, упрыгожанае кветкамі.

Фота МІХАЛА МІНЦЭВІЧА

Мясцовая легенда (якую я даведаўся ў Гмінна-гарадскім доме культуры ў Кляшчэлях) паведамляе, што калісь адна мясцовая жанчына не магла мець дзяцей, хаця вельмі гэтага хацела. Узяла яна на выхаванне свайго пляменніка, якому пасля загадала, каб прынёс ён ахвяру Богу: пабудаваў каплічку і паставіў крыж. Так яно і сталася.

Пасля, калі яшчэ не было дарогі з Дабрывады ў Кляшчэлі, тая каплічка адыгрывала ролю своеасаблівага арыенціра. Вясною, з-за балоцістага і дрыгвяністага бездарожжа людзі паводле яе вызначалі праходны шлях. Гэтаксама зімою — на белай раўніне яна паказвала напрамак людзям, якія падаваліся ў Кляшчэлі на базар ці ў царкву.

Тое месца, усё-такі, шмат гадоў зарастала карчамі і зеллем. Але па ініцыятыве Сяргея Смыка, солтыса Дабрывады, навакольныя жыхары ўпарадкавалі легендарнае і як жа ў свой час прыдатнае на практыцы месца. Сёння яно задбанае, але акружаная высокімі рабінамі каплічка з крыжам хавае за імі сваю таемнасць.

Міхал Мінцэвіч

Плакалі бацькі і дзеці

Лявон Маціевіч з Дубіч-Царкоўных меў шасцёра дзяцей: двух сыноў і чатыры дачкі, якіх усіх трэба было дагледзець і ягоная жонка Маня, вельмі спакойная і добрая жанчына, мела, як у нас гаворыцца, работы па самыя вушы. Дзядзька Лявон меў нямала зямлі, і хаця яна была пясочная, дазваляла сям'і жыць без голаду і дружна.

Калі ўспыхнула савецка-нямецкая вайна, вёска амаль у цэласці згарэла, уцалела мо толькі сем хат, у тым ліку і хата дзядзькі Лявона. Пагарэльцы гнездзіліся на сваіх панадворках у прымітыўнах шалашах, а некаторыя жылі ў школьным будынку, які таксама ўстояў перад пажарам. Час, аднак, не стаяў на месцы, надышла восень з хо-ладам і тады Лявон са сваім старэйшым сынам Алёшам сталі намаўляць маіх бацькоў перайсці зімаваць у іхнюю хату; бацькі ахвотна пакарысталіся гэтай гуманнай дапамогай. Лявон Маціевіч прыняў у сваю хату яшчэ і шасці-асабовую сям'ю Трахіма Панфілюка і ўсе зімавалі дружна, як адна сям'я. Былі і такія вяскоўцы ў ацалелых хатах, якія ў тую цяжкую зіму нікога не прыгарнулі.

У дзядзькі Лявона была дачка Надзя, народжаная ў 1926 годзе. Пад свята Юрыя, 6 мая 1943 года адбыўся чарговы набор маладых людзей на працу ў Нямеччыну, які з Дубіч захапіў Надзю Маціевіч і Ефрасінню Жук. Бацькі завезлі іх фурманкамі ў бельскі арбайтсамт, а адтуль усіх пагналі ў таварныя вагоны. Развітанне было цяжкае і жудаснае, плакалі бацькі і дзеці. Прыгонных вартавалі ўзбро-еныя вартаўнікі. Надзя хацела ехаць разам з аднавяскоўкай, якая апынулася ў іншым вагоне, і хацела таксама туды перабегчы, але немец ударыў яе некалькі разоў па твары; пасля, калі ён даведаўся, што Надзя хацела толькі ехаць з зямлячкай, дазволіў ёй памяняць вагон. Так даехалі да Голдапа і там іх дарогі разышліся назаўсёды; Ефрасіння Жук не вярнулася ўжо дадому...

З голдапскага арбайтсамта Надзю забраў гаспадар Людвіг Лісын у маёнтак Обэрх. Гаспадарка была вялікая: 14 коней, каля трыццаці кароў, мо з 25 свіней, многа авечак і каля тысячы курэй. Вялікія мураваныя гаспадарчыя будынкі былі акуратна дагледжаныя. Гаспадыня Анна мела непрыемны характар. У гаспадароў было чацвёра дзяцей: дачка была ўжо замужам, а тры сыны на вайне. Адзін сын загінуў на ўсходнім фронце і бацькі вельмі плакалі калі прыйшло паведамленне з чорнай палоскай.

У гаспадара працавалі яшчэ чатыры сям'і: з Кіева, Палтавы, Млавы і Бе-ластока; да ўкраінцаў гаспадар адносіўся больш прыхільна; мо таму, што сям'я з Палтавы даносіла на іншых. Сем'і рабочых жылі асобна, у іншым доме, чым гаспадары, а Надзя жыла ў доме гаспадароў на паддашшы. Працаваць трэба было належна, значыць цяжка, аднак Надзя са сваімі абавязкамі спраўлялася добра, таму ніколі галоднай не была, бо Людвіг сумленных людзей паважаў, хаця сам быў гітлераўцам і меў аж шэсць вінтовак. На гарышчы жыў старэнькі, мо каля ста гадоў яму было, бацька Людвіга або Анны, які таксама трымаў пісталет пад падушкай. Пазней, недзе вечарам, вярнуўся дадому адзін сын Людвіга, які заўсёды хаваўся ад людзей — відаць здэзерціраваў з фронту.

Надзея добра згадвае нямецкіх гаспадароў сваёй няволі. Наглядала яна за парадкам у хлявах і аборы. Калі прыблізіўся фронт і сталі чутны ўзрывы снарадаў, гаспадар сабраў найбольшыя каштоўнасці ў валізкі і адправіў з імі жонку да дачкі, а яго самога адправілі недзе пад Кёнігсберг для капання акопаў. За Аннай паехалі і ўсе тыя, што працавалі ў маёнтку, у іх ліку і Надзя. Каля Кёнігсберга іх размеркавалі па іншых гаспадарах — Надзя трапіла да чарговага гаспадара, а пасля трох месяцаў да наступнага. Там кармілі слаба, але нечаму дзівавацца, бо ўжо і самыя немцы не аб'ядаліся, толькі разглядаліся, каб уцячы з таго пякельнага месца на захад — далей ад рускіх.

У студзені 1945 года ў мясцовасць каля чыгуначнай станцыі Бішэнгруб, дзе была Надзя, увайшлі саветы. Паводзілі яны сябе як на вайне, але наша гераіня ўцалела; мо таму, што яна штодзённа пастаянна шчыра малілася Богу. Аднойчы адзін п'яны рускі салдат без ніякай прычыны прыставіў штык вінтоўкі да яе грудзей, але іншы салдат адагнаў яго і нават аблаяў.

Дамоў Надзя вярнулася 15 лютага 1945 года; шмат дарогі давялося ісці пяшком. А год пасля вяртання, 15 лютага 1946 года, яна выйшла замуж за мясцовага хлопца Мікалая Хіліма-нюка, якому нарадзіла дзве дачкі: Ніну і Зіну. Сёння Надзея і Мікалай Хіліманюкі на заслужанай пенсіі. А згаданы раней брат Надзі Алёша зараз пасля вайны загінуў ад узрыву снарада, які падросткі знайшлі ў хваіне.

Мікалай Панфілюк

Вучылася на краўчыху

Успаміны Анны ЗІНЧУК з Канцавізны, народжанай у 1931 годзе.

Пры санацыі хадзіла я ў школу тры гады, у Сураж. Настаўнікам там быў Гілевіч з Суража, вучылі на польскай мове ды і маліліся па-польску. Пасля стала я вучыцца на краўчыху ў пані Гурскай, таксама ў Суражы. Плацілі ёй збожжам ды памагалі пры розных працах. Хадзіла да яе год часу, кожны дзень апрача святаў. Калі гліністая дарога з Канцавізны ў Сураж была непраходная, або зімою засыпаная снегам, тады жыла ў свае майстрыхі. Спярша вучылася фастрыгаваць, пасля абкідаць, мерыць, выкройваць. Яшчэ па сённяшні дзень помню, колькі чаго мае быць сантыметраў. Пасля гадовага абучэння стала шыць сама. Была ў нас дома швейная машына „Зінгер" і я на ёй шыла ўсё — ад бялізны па палітоны і касцюмы. І ўручную шыла, бо пільная і цярплівая была. Людзі пры-носілі мне свой матэрыял, які най-часцей куплялі ў Лапах. У Суражы крамаў з тканінамі не было і людзі хадзілі ў адлеглыя за дзесяць кіла-метраў Лапы, дзе можна было пра-даць масла і іншыя прадукты. Бывала, што і ў Беласток ездзілі — хадзілі на поезд у Страблю ці Зімнохі і адтуль ехалі.

Пасля вайны нашу вёску шэсць разоў рабавалі, а на сёмы спалілі. Мужчыны і старэйшыя хлопцы ўцякалі тады ў стагі над Нарвай. Рабаўнікі былі панакрываты плахтамі, прыходзілі, заганялі ў камору і адтуль выклікалі і пыталі як хто называецца; дарослых дзяўчат гвалтавалі. Праўдападобна былі гэта суражакі, бо пасля пры гарэлцы выгаворваліся хто хадзіў. Калі палілі вёску, згарэла пяць хатаў і ўсе стадолы. Забілі аднаго чалавека.

Запісаў Аляксандр Вярбіцкі

Як Герэк і Ярашэвіч у Белавежы гасцявалі

Роўна трыццаць гадоў таму ў Белавежы поўным ходам ішла падрыхтоўка да візіту важных гасцей — І сакратара ЦК ПАРП Эдварда Герка і прэм'ера Пятра Ярашэвіча. Яны мелі тут затрымацца на два дні, перад Цэнтральнымі дажынкамі, якія былі назначаны ў Беластоку на 2 верасня 1973 г.

Я тады ўжо паўтара года працаваў у Прыродазнаўчым музеі БНП і можна сказаць, знаходзіўся амаль у цэнтры ўсіх дзеянняў, звязаных з прыняццем гэтак высокіх гасцей. Парадкаваўся тады ўвесь Палацовы парк, асабліва тыя алеі, па якіх мелі праязджаць Герэк і Яра-шэвіч. Працаўнікі Бюро аховы ўрада знаёміліся з усімі паркавымі зака-вулкамі. Правяралі таксама дакладна запаведнік, у які госці таксама мелі з'ездзіць, кантралявалі стражнікаў. Бадай на тыдзень да прыезду сакратара і прэм'ера забаронена было ўпускаць у запаведнік турыстаў і экскурсіі.

У той сам час дзве працаўніцы музея Любу Бушко і Ніну Рагачэўскую пры-значылі для помачы ўрадавым кухарам пры падрыхтоўцы ежы. Для той самой мэты з Надлясніцтва Белавежа пасланы былі тры жанчыны. Кабет найперш звазілі ў Беласток для праверкі іхняга стану здароўя. Потым яны перайшлі прафесіянальную падрыхтоўку.

Тым часам па Белавежы разышлася чутка, што для прыёму Герка і Ярашэвіча рыхтуецца таксама палацык у Харошчы. Некаторыя белавежцы пачалі сумнявацца, ці госці захочуць прыехаць у Белавежскую пушчу. Паляў-нічы дом у Белавежы — іхняе прыстанішча, як бы не гаварыць, сваёй камфартабельнасцю далёка адбягаў ад харашчанскай рэзідэнцыі. Усё ж лідэры дзяржавы рашыліся на Белавежу. Прыехалі ў яе 31 жніўня. Гасцей прымаў Белавежскі нацыянальны парк і Дзяржаўныя лясы.

У сам Палацовы парк можна было ўвайсці свабодна, але ўжо ваколіца Паляўнічага дома была закрытай зонай для пабочных асоб. На час знаходжання надзвычайных гасцей, гасцініца гэтая, як правіла, не прымала ўжо іншых кліентаў. Тадышні захавальнік фондаў музея, д-р Чэслаў Аколаў, які меў вадзіць гасцей па аб'ектах Нацыянальнага парку, быў паспешна сцягнуты з водпуску над морам. Аб даверанаму яму заданню не мог нікому гаварыць. Неяк дзіўна і заадно смешна гэта выглядала, бо ў той час аб прыездзе І сакратара ПАРП і прэм'ера ў Белавежу ведалі хіба ўсе. Таксама, як усе ведалі, што важнейшых гасцей пераважна абслугоўвае ніхто іншы, як д-р Аколаў.

У першым дні знаходжання ў Белавежы госці пабачылі зуброў і з'ездзілі ў строгі запаведнік прыроды. Тут даехалі толькі да Дуба Ягайлы, які ў той час яшчэ стаяў; зваліўся ён праз год. Вечарам у 475 квартале пушчы Дзяржаўныя лясы падрыхтавалі начальнікам дзяржавы вогнішча. Раней збудавалі абшырны прыстрэшак з лавамі і сталом. Месца гэтае ад таго часу пачалі называць Геркуўкай. Потым Дзяржаўныя лясы прымалі ў ім іншых выдатных гасцей, на-прыклад, Яна Дабрачынскага, пісара і заадно старшыню Рады краёвай ПРОН (26 лютага 1985 г.). У 1997 г. Геркуўку наведалі ўдзельнікі адной з тэматычных секцый V Кангрэса польскіх леснікоў, якія пастанавілі назваць расту-чы тут магутны, шмат-вяковы дуб — Кангрэсавым.

1 верасня Герэк і Ярашэвіч наведалі Прыродазнаўчы музей. Запамятаўся мне асабліва вось такі смешны эпізод. Пасля ўваходу госці пакінулі свае плашчы на прылаўку раздзявальні. Услужны прыбіральшчык, Васіль Грыгаровіч, хацеў іх павесіць на вешалцы, але ў той момант падскочылі да яго ахоўнікі і забаранілі яму нават датыкацца да вопраткі гасцей. Спадар Васіль збялеў на твары, а потым недзе схаваўся. Пасля амаль гадзіннага наведвання (у той час мы нікога з турыстаў не пускалі ў музей) д-р Аколаў падсунуў гасцям памятную кніжку, каб яны ў яе ўпісаліся. Нечакана для нас усіх Герэк адмовіўся. Сказаў, што тыя зычанні, якія мелі б напісаць, былі б накіраваны ім самім. Ярашэвіч зрабіў міну, быццам з выказваннем свайго таварыша поўнасцю пагаджаўся. Захавальнік фондаў музея не настойваў, закрыў кніжку. Госці накіраваліся да выхаду. І так, па іхнім візіце ў музей не астаўся аніякі след.

Пасля абеду Герэк і Ярашэвіч падаліся ў вёску Ябланова-Выпыхы, наведаць старасту дажынак, Яна Ябланоўскага.

Кіраўнікі Польшчы падчас знаходжання ў Белавежы стараліся паводзіць сябе звычайна, непасрэдна, адным словам — не надымаліся. Усё ж адчувалася нейкая адзеравянеласць. Нашы працаўніцы, якія памагалі пры падрыхтоўцы ежы гасцям, доўга не маглі пагадзіцца з тым, што кухары выкройвалі з пластоў шынкі толькі невялікія кружкі, а рэшту адкідалі. А ў тым часе шынкі ў звычайных вясковых крамах амаль зусім не бачылася.

Ад таго часу прайшло трыццаць гадоў. Няма ўжо ў жывых герояў майго ўспаміну, шмат што змянілася так у Белавежы, як і ў цэлай дзяржаве. Адно толькі асталося па-старому. Важныя госці як ехалі ў Белавежу, так і едуць надалей.

Пётр Байко

Селяніну вецер у вочы

У канцы дзевяностых гадоў швагер з Дубяжына перапісаў на маё прозвішча сенажаць, якая знаходзіцца ва ўрочышчы „Пухава" за Вулькай-Выганоўскай. Дакументы афармілі ў натарыуса, зарэгістравалі ў вячыстай кнізе Бельскага суда. Так я стаў чыгуначнікам-земляробам. Праўда, здзелка аказалася нявыгаднай для мяне, паколькі ўласнасць знаходзілася ў далечыні, больш за дваццаць кіламетраў. Мая роля абмяжоўвалася затым да платы сельскагаспадарчага падатку і складчыны ў водную суполку.

Ад некалькіх гадоў хачу „перанесці" гэтае поле на тэрыторыю Чаромхаўскай гміны. Ёсць такая магчымасць, паколькі свабодных участкаў ёсць многа. Маё першае прашэнне было адкінута Агенцтвам сельскагаспадарчай уласнасці ў Сувалках. Прапанавалі поле не тое, якое хацеў. У гэтым годзе зусім адмовіліся. Аргументавалі, што на тэрыторыі Вулькі-Выганоўскай знаходзіцца шмат нядобраўпарадкаваных сенажацяў, на якія знайшоўся б пакупнік або хтосьці ўзяў бы ў арэнду. Мая аргументацыя, што селяніну-пенсіянеру неэканамічна апрацоўваць сенажаці адлеглыя больш за дваццаць кіламетраў ад месца пражывання, не знайшла зразумення. Я паслаў заяву ў Самаўрадавую апеляцыйную калегію ў Беластоку. І тут атрымаў адмоўны адказ. У аргументацыі чыноўнікі заяўлялі, што для абмену неабходная згода абодвух бакоў, г.зн. мая і Агенцтва сельскагаспадарчай уласнасці, як уладальніка маёмасці, на якую хачу памяняць сваё поле. Такі вось закон. Гэтае рашэнне канчатковае ў адміністрацыйным працэсе, паколькі яго не адменіць Вярхоўны адміністрацыйны суд. Я зразумеў, што няма сэнсу пісаць туды, бо і так нічога ў гэтай справе не зменіцца. У народзе кажуць — беднаму вецер у вочы.

Уладзімір СІДАРУК

Та-а-а-кая рыба ў Сухавольцах!

У 1991 годзе паляўнічыя з гуртка „Цецярук" у Кляшчэлях купілі дзевяцігектарнае няўгоддзе каля Сухавольцаў і за зіму стварылі там трохгектарны вадаём для выводу рыб, качак і іншай дробнай звярыны. Цяпер паляўнічыя могуць там праводзіць свабодны час разам з сем'ямі, вудзіць рыбу або пастраляць да дзікіх качак. Гэта прыемнае і карыснае.

Расказвае лоўчы Яўген Адамец з Кляшчэль:

— 21 чэрвеня г.г. у суботнюю раніцу на вадаёме „Сухавольцы" мой швагер, паляўнічы Базыль Младзяноўскі з Бельска-Падляшскага, злавіў на вуду два вялікія карпы; адзін важыў 11,5 кілаграма, а другі — 7. Спярша на прыманку, кукурузу, палакоміўся большы карп. Лёска „дзесяцікілаграмовая" патрабавала далікатнасці. Змаганне доўжылася паўгадзіны і карп развітаўся з вадою. Праз гадзіну яго следам палакоміўся меншы карп. І ўлову на той дзень хапіла. Карпы былі такія вялікія, што давялося іх разрубваць сякерай, бо разрэзаць нажом не ўдалося. Рыбы трапілі ў маразілку і хопіць іх дзвюм сем'ям.

Рэпрадукцыя здымка МІХАЛА МІНЦЭВІЧА

Рэкордны ўлоў прэзентуюць Яўген Адамец і ягоная дачка Анэта Казлоўская

Міхал Мінцэвіч

Сапсаваныя канікулы

Прыехалі да дзядзі Геніка сястрыныя сыны на канікулы. Дзядзька жыве ў маленькай вёсцы недалёка рэчкі Нарвы. Часта ён з хлопцамі катаўся на лодцы па рэчцы. Конрад вельмі любіць прыязджаць сюды.

Усе вяскоўцы прабываюць над вадой у гарачыя летнія месяцы. Здавён-даўна ўсе любяць плёхацца ў вадзе і лавіць рыбу і ніхто ім гэтага не забараняў.

А тут восьмага жніўня здарылася прыкрая справа. Дзядзьку Геніка прывезла паліцыя і зрабіла вобыск на панадворку, у шопцы і ў доме. Знайшлі яны старыя, падраныя сеці. Паліцыянты саставілі пратакол і палічылі яго вялікім злачынцам. Конраду загадалі паламаць і парэзаць кломлю, якой у сваім ставе лавілі карасёў. Сцэна вобыску надоўга замацавалася ў вачах малых хлопцаў.

Над Нарвай за ўрочышчам Марушка летам на балоце ад вадасховішча застаецца на ямах вада. У іх засталася таксама рыба. Падгледзеў гэта Генік і хацеў налавіць яе для хлопцаў, каб упусціць у свой стаў, бо на тым балоце яна і так паздыхала б. Водная страж, якая ахоўвае Семяноўскае вадасховішча да Бандароў, прыехала ў Марушку і затрымала Геніка з яго братам. Паставіліся да іх як да зладзеяў і бандытаў. Штурхалі іх нагой у жывот і таўклі па спіне. Генікаваму брату ад пабояў зрабілася грыжа, а самому Геніку паламалі рабрыну. Хворыя дзядзькі не змаглі ўжо апекавацца хлопцамі і тыя паехалі дадому.

Вядома, што на вадасховішчы нельга лавіць рыбу. Але ці па-за ім воднай стражы можна адабраць лодку і сапсаваць прыемныя канікулы малым хлопцам? Які гэта прыклад з боку ўладных структур, якія павінны служыць для дабра грамадства.

(мэл)

Селянін, што далей?

Сяляне ад будучага года і праз наступныя два гады змогуць карыстацца гэтак званай структурнай дапамогай Еўрасаюза. Міністэрства сельскай гаспадаркі апрацавала праект мадэрнізацыі харчовага сектара, у рамках якога можна будзе пакарыстацца гэтымі грашыма.

Тыдзень таму пісалі мы аб еўрасаюзнай дапамозе ў рамках праграмы, якая агульна датычыць развою вясковай тэрыторыі. Аднак, гэта не ўсе формы дапамогі, якімі можам пакарыстацца. Знойдуцца грошы таксама і на інвестыцыі ў гаспадарках, галоўным чынам на сучаснае абсталяванне, паправу ўмоў і бяспекі працы, дастасаванне да еўрасаюзных патрабаванняў у галіне гігіены харчоў, паляпшэнне ўмоў гадоўлі жывёлы і аховы асяроддзя. Канкрэтна, справа ў пабудове і рамонце гаспадарчых будынкаў, закупцы машын для земляробства, папраўляючых гігіену прадукцыі, закупцы грунтаў і будынкаў прызначаных для прадукцыі, закупцы жывёлы. Разам на гэтыя мэты можна атрымаць не больш чым 160 тысяч зл. Больш могуць атрымаць маладыя сяляне, гаспадаркі якіх распаложаныя на тэрыторыі з некарыснымі ўмовамі гаспадарання. Каб атрымаць дапамогу, трэба, аднак, дакладна запланаваць інвестыцыю, сабраць неабходныя дакументы, запоўніць заяву. Заявы падаецца ў Агенцтва рэструктурызацыі і мадэрнізацыі сельскай гаспадаркі. Яго аддзелы даюць таксама дэталёвыя інфармацыі. Што важнае, грошы, падобна як і ў іншых выпадках, Агенцтва вяртае пасля выканання прац і прад'яўлення рахункаў.

Іншая форма еўрасаюзнай дапамогі — грошы, якімі могуць карыстацца сяляне гмін у рамках Праграмы аднаўлення вёскі. Справа перш за ўсё ў паправе ўмоў сялян. На распрацаванне такой праграмы можна атрымаць максімальна 50 тыс. зл., а на яе рэалізацыю — 400 тыс. злотых. Аднак, каб старацца за гэтыя грошы, трэба распараджацца дваццаціпрацэнтным уласным укладам. На гэтыя сродкі могуць разлічваць праекты ўзніклыя па ініцыятыве саміх жыхароў вёсак або вяскова-гарадскіх тэрыторый, не налічваючых больш 5 тысяч асоб ды лакальныя групы дзеяння (прынцыпы і крытэрыі іх засноўвання маюць быць яшчэ акрэслены). Праекты мусяць быць, аднак, у згодзе з прынятай гмінным самаўрадам стратэгіяй развою. Дамовы падпісваецца з маршалкоўскай управай. Заявы з праектамі падаюць гміны.

Шмат гаспадарак, у сувязі з уваходам Польшчы ў ЕС, будзе мусіла пераквалiфікавацца. На г.зв. шматфункцыйны развой вёскі, затым абмежаванне беспрацоўя насялення маюць таксама знайсціся грошы. Такая дапамога будзе ахоплівацъ галоўным чынам разбудову і адаптацыю жылля і гаспадарчых будынкаў на агратурыстычныя мэты і іх абсталяванне (да 5 гасцінных пакояў, памяшканняў супольных для гасцей, ванных і кухонных анексаў) ды абсталяванне месц для адпачынку, закупку абсталявання пакояў і турыстычнага ці для адпачынку для агратурыстычнай дзейнасці, а таксама закупку жывёлы для тэрапеўтычных, спартыўных і адпачынковых мэт. Разам можна атрымаць не больш чым 100 тыс. зл. Пры хадайніцтве аб дапамозе будуць брацца пад увагу: падаткавы даход гміны, у якой знаходзіцца гаспадарка пералічаны на аднаго жыхара, узровень беспрацоўя на гэтай тэрыторыі, колькасць *przeliczeniowych* гектараў паверхні, якая прыпадае на адну асобу працуючую ў гаспадарцы, узрост падаючага заяву. Заявы разглядаць будзе Агенцтва рэструктурызацыі і мадэрнізацыі сельскай гаспадаркі.

Грошы маюць таксама знайсціся на развой і паляпшэнне тэхнічнай інфраструктуры звязанай з сельскай гаспадаркай. Справа ў пабудове ці мадэрнізацыі ўнутраных дарог (сярод іх даязных на палеткі і ў лес; да 200 тыс. зл.), індывідуальных сістэм забеспячэння вадой і яе паляпшэння (да 40 тыс. зл.), каналізацыйнай сеткі (да 80 тыс. зл.) і абсталявання забеспячэння электраэнергіяй (да 120 тыс. зл.). Дапамогу могуць атрымаць жыхары або вядучыя гаспадарчую ці сельскагаспадарчую дзейнасць на вясковай тэрыторыі да 5 тысяч жыхароў.

Усімі дэталёвымі інфармацыямі, якія датычаць таксама і іншых форм дапамогі для сельскай гаспадаркі і вёскі ад будучага года распараджаецца ведамства сельскай гаспадаркі Падляшскай маршалкоўскай установы.

(холм)

Ніва ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Мірановіч.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (0 10xx 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*

Zrealizowano przy pomocy finansowej Ministerstwa Kultury.
Галоўны рэдактар: Віталь Луба.
Сакратар рэдакцыі: Аляксандр Максімюк.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Ада Чачуга, Паўліна Шафран.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Камп'ютэрны набор: Яўгенія Палоцкая, Марыя Федарук.
Друкарня: „Orthdruk", ul. Składowa 9, Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: 1. Termin wpłat na prenumeratę na IV kwartał 2003 r. upływa 5 września 2003 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch" na terenie całego kraju.
2. Cena prenumeraty na IV kwartał 2003 r. wynosi 26,00 zł.
3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 115,00; pocztą lotniczą Europa — 127,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 153,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 12401053-40060347-2700-401112-005.
4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,40 zł, a kwartalnie — 44,20 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 4,70 (kwartalnie — 61,10), pocztą priorytetową: Europa — 5,90 (76,70), Ameryka Płn., Afryka — 6,60 (85,80), Ameryka Płd., Środk., Azja — 7,40 (96,20), Australia — 9,60 (124,80). Wpłaty przyjmuje Rada Programowa Tygodnika „Niwa", Białystok, ul. Zamenhofa 27, nr konta PBK S.A., I Oddział Białystok, 11101154-401150015504.

Н!ўка

http://www.afreefunny.com/

„Даўціпы” *Андрэя Гаўрылюка*

— Якая розніца між бусламі і дзецьмі?

— Буслы прылятаюць і адлятаюць, а дзеці астаюцца.

* * *

Цёмны вечар, у гняздзе сядзяць двое буслоў.

— Электрастанцыя зноў адключыла святло, — адзываецца адзін з іх. — Праз дзевяць месяцаў зноў усё будзе на нас!..

* * *

Загадчык крамы кліча на размову маладую прадаўшчыцу, якая спазнілася дзве гадзіны на працу.

— Даруйце мне, — тлумачыцца дзяўчына, — бо я цяжарная...

— Колькі часу?

— Я ведаю?.. Мо будзе з дзве гадзіны...

* * *

— Янка, чаму ты цэлы ў сіняках? Хто цябе пабіў, жонка?

— Не, яе муж.

* * *

Гутараць два дашкольнікі:

— Чаму немаўлят прыносяць буслы?

— Падумай лагічна: калі б немаўля паслаць поштай, спатрэбілася б наклеіць на яго многа марак. А хто ж меў бы сумленне тыя маркі на такім маленстве штампаваць?

Адгаданка

Пачастунак

(анаграмная шарада)

Арцёма і Глікерыю наведала кума —
У замежжы фунты і долары грабла яна;
Не бачылі шмат часу і амаль яе забылі
Ды найлепшае, што ***МЕЛІ****, ёй на стол накрылі.*
Ёй чарку першачку, ***А*** *сабе адно віно...*
БОДРА *размова йдзе пра чалавечы род,*
Гавораць ***АБ*** *раю там і пекле тут.*
Кума ўплятае шынку й каўбасу...
ЕЛА *кума,* ***А*** *сківіц* ***РУХ*** *слабеў,*
У жываце яе набітыя ўжо ***ДНО*** *і верх —*
Што ў халадзільніку было, змясціла ўсё!
Апаражніла і Арцёмаў першачок.

З літар патоўшчаных слоў скласці рашэнне — прыказку — з першымі літарамі і іх лікам у паасобных адгадваемых словах: **М-5, Д-5, А-3, Б-5, А-4.**

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя адказы, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 27 нумара

„Белаз”, міна, хабар, яд.

Рашэнне: **Няма ліха без дабра.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Аляксандру Дабчынскаму** і **Лукашу Пацэвічу** з Беластока.

Дафінікійскі бакс

Паехаў я ў недалёкае замежжа. Еду сабе па тым замежжы бестурботна, аж запыняе мяне чалавек у форме. Скручвае лісток паперы ў трубку, падсоўвае мне праз акенца і кажа:

— А ну, дыхні!

Я кінуў у тую яго трубку пяць баксаў. Фарміст паглядзеў на мяне пагардліва і зноў працягнуў мне сваю папяровую пасудзіну:

— Дыхні яшчэ раз!

Я кінуў адзін бакс. Фарміст глянуў, пачырванеў і зароў:

— А ну, дыхні так як у першы раз!

Кінуў я зноў зялёны пятачок, чалавек у форме адвярнуўся і я, імгліва працверазеўшы, пакалясіў далей.

Пад’язджаю да горада. Перада мною закрасаваўся дужы стэнд з аб’явай: „Женжчина! Мущину на час-два. Тел. ...”; такімі дакладна літарамі было там напісана.

— А гэта што за дзіва? — падумаў я. — У сённяшні разэманцыпаваны час, калі жанчыны сталі трактарысткамі ды штангісткамі і заняліся боксам ды кіданнем молата і кавальскіх абцугоў ды ўсялякімі іншымі чартоўскімі выдумкамі, навошта ім патрэбныя мужчыны? Хіба што толькі для нейкай фанабэрыі, быццам кабыле авёс...

Паколькі ў тэлефоннай кніжцы для нашага ваяводства побач майго прозвішча красуецца яшчэ падказка, што я з’яўляюся і журналістам, і рэдактарам, а да таго ж і паэтам яшчэ, дык па звычайнай службовай цікавасці рашыў праведаць, у чым тут справа. Прапанаваны нумар тэлефона амаль поўнасцю супадаў з маім нумарам агульнай электроннай сістэмы ўліку насельніцтва, дык ён мне лёгка запамятаўся і ўжо з горада я пазваніў туды. У трубцы малады жаночы голас заваліў мяне такой колькасцю інфармацыі, што я амаль зусім разгубіўся і дакладны змест размовы забыў. А ж ехаў я не ў службовых мэтах дык, паколькі нават пішуся рэдактарам, не забраў з сабою дыктафона, ну і сёння магу пра змест гутаркі расказаць толькі з вялікімі скарачэннямі і магчымымі скажэннямі.

Справа ў тым, што тыя разэманцыпаваныя феміністкі-мускуліністкі, якія заняліся боксам і кіданнем молата, не маюць цяпер часу на традыцыйныя жаночыя дамашнія працы. Ды астаўся нейкі лік зусім лянівых жанчын, якім не хочацца натрэніроўваць сабе штангісцкіх мускулаў і ім, хаця часу маюць удосталь, некаторыя дамашнія заняткі не пад сілу. Бываюць і такія спрактыкаваныя жанчыны, якія прыкідваюцца неспрактыкаванымі, і такія, якія ведаюць, што ў міні-спаднічцы не толькі лягчэй хадзіць, але і лягчэй жыць. Ды і ўявіце сабе, што нейкая вельмі кругленькая чэмпіёнка *sumo* або кідання кавальскіх абцугоў хоча пераставіць у сваёй кватэры мэблю або нават абуць туфлі: сама гэтага не зробіць калі і мае час — не сагнецца! Вось і дзеля ўсіх гэтых паняў і працуе ў горадзе загадкавая, здавалася б, фірма, якая прапануе мужчын — майстроў на ўсе рукі; загадвае ёю, як можна было дадумацца, жанчына. Здаўна гаворыцца, што ўсё ў руках чалавека, а чалавек — у руках жанчын...

Мужчын у фірму падбіраюць на спецыяльных касцінгах, у час якіх паказваюць яны сваё майстэрства ў варэнні абедаў, шыцці спадніц і дамскіх нагавіц, змыванні ўсялякай пасуды, стрыжцы сабак, выбіванні дываноў, зашпільванні туфляў, манікюры... І попыт на такіх спецыялістаў даволі вялікі. Зацікавіла мяне толькі, ці разлік за паслугі адбываецца ў баксах, ці ў таемных мне купюрах нейкага тамашняга нацбанка. Паглыбіўшыся ў валютныя роздумы дайшоў я да бартэра і прыгадаў сабе адзін выпадак, які некалькі гадоў назад здарыўся на нашай славутай Гайнаўшчыне.

У адной вёсцы жыла адзінокая жанчына, каторая трымала карову, якая лічыцца карміліцай чалавека, і сабаку, які лічыцца прыяцелем чалавека, у гэтым выпадку — гаспадыні. Летам загатовіла яна сваёй кароўцы сена, а паколькі не трымала каня і не была трактарысткай, дык спатрэбіўся ёй нехта, хто б тое сена прывёз у яе клуню. Звярнулася яна ў гэтай справе, так як гэта ў нас завялося і яшчэ не звялося, да суседа, адзінокага мужчыны. Людзі ў нас дружныя і таму сусед, які каровы і сабакі не меў, але меў трактар, ахвотна сена прывёз. Жанчына наша была вельмі сумленная, не ўяўляла сабе, што можна толькі аддзякавацца за выкананую паслугу. Багацейкай яна не была, купюр ні нашага, ні нашых саюзнікаў банка не мела ў дастатковай колькасці і таму запрапанавала свайму суседу разлік у той валюце, якою жанчына заўсёды можа і магла расплаціцца — нават у той незапамятны час, калі яшчэ фінікійцы не выдумалі слаўных сваіх рублёў. Сусед прапановай узрадаваўся, быццам конь аўсом, і яны тут жа, на толькі што прывезеным сене, ухапіліся зводзіць свае рахункі.

Калі даўжнічка стала павойкваць ад уласцівага гэтаму віду разліку хвалявання, яе сабака, які быў законным сведкам здзелкі, западозрыў, што яго гаспадыні дзеецца крыўда і дзеля прадухілення махлярства кінуўся таксама ў тую бухгалтэрыю, ушчаперыўшы зубы ў зусім безабароннае задняе месца крэдытора...

Цяжкая цяпер настала мужчынам доля: жанчыны не толькі трымаюць дома пародзістых мускулістых сабак. Да таго ж скачуць у баксёрскіх рукавіцах ці з кавальскімі абцугамі, рассейваючы страх сярод і без таго баязлівых мужчын. Яшчэ і парассядаліся ў розных дырэктарскіх і загадчыцкіх крэслах, узяўшы мужчын у поўную аблогу; даўціпы пра дырэктараў трэба забыць! Ну, і той дзіўны правапіс застаўляе прызадумацца: так ужо бабы ў нас расхадзіліся, што нават у правапісе забралі сабе ад нас цвёрдае „ж”, пакідаючы нам адно вялае „ш”. Голым вокам відаць, што з суб’екта грамадскага жыцця зводзяць нас адно да яго аб’екта, быццам тавар нейкі, вялы прадмет. Вось да чаго дайшло: дажыліся палякі, што ні каровы, ні сабакі — як гэта гаварылі калісь нашы людзі, пры санацыі. Нам, мужчынам, жанчыны патрэбны хаця б дзеля таго, што не ўсё можна зваліць на ўрад. І мы мроім пра такіх жанчын, якіх можна было б любіць, шанаваць і падманваць, а яны вось што нам рыхтуюць! Поўнае беззаконне...

З такімі горкімі думкамі адышоў я ад трубкі і сеў у машыну. Запусціў матор, еду. Запыняе мяне чалавек у форме:

— Вы парушылі закон! З вас штраф...

— Колькі? — пытаю я.

— Паводле закона два баксы, але ж вы хіба ведаеце, што ў нас поўнае беззаконне?..

Цім Паводзін

ISSN 0546-1960